

ЯК ВЁСКІ СТАНАВІЛІСЯ ПУСТЫНЯМІ 7

ПРАКТОЛАГ — ПРА ДАЛІКАТНЫЯ ПРАБЛЕМЫ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 ЖНІЎНЯ 2021 г. СУБОТА № 150 (29519)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Антон БЫЧКОЎСКІ, афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта:**

*«З улікам становішча, якое склалася, калі літоўскі бок арганізавана дастаўляе да нашай граніцы замежнікаў, якія імкнуцца атрымаць прытулак у краінах Еўрасаюза, а таксама ў мэтах недапушчэння правакацый з боку Літвы, органы пагранічнай службы задзейнічалі ўсе неабходныя сілы і сродкі для прадухілення незаконнага перасячэння граніцы Рэспублікі Беларусь. На працягу ўсяго ўчастка Дзяржаўнай граніцы з Літвой выкарыстоўваюцца мабільныя тактычныя рэзервы пагранічных груп і атрадаў, дадаткова экіпіраваныя для вырашэння пастаўленых задач».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Усё, што мы ўзводзім і ўзмацняем — масты, дарогі, гарады, незалежнасць нашай дзяржавы, — павінна стаць асновай для будучых дасягненняў нашых дзяцей»

**Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця Усходняга моста ў Гродне**






**Кіраўнік дзяржавы падзякаваў усім, хто прыйшоў на цырымонію. Асаблівую падзяку ён выказаў будаўнікам, якія за рэкордна кароткі тэрмін (усяго паўтара года) стварылі такі прыгожы мост. Сродкі на яго будаўніцтва выдзяляла ўся краіна.**

СТАР. 2

Алімпійскі дзённік

TOKYO 2020

# УСЯ АЛІМПІЯДА — БАРАЦЬБА

**Барэц вольнага стылю Магамедхабіб Кадзімагамедаў заваяваў сярэбраны алімпійскі медаль. У паядынку за чэмпіёнскі тытул у вагавой катэгорыі 74 кг ён саступіў расіяніну Заурбеку Сідакаву. У першыя хвіліны вырашальнай сустрэчы барцы не парадавалі багаццем тэхнічных дзеянняў. Вынік паядынку — 7:0 на карысць расіяніна.**

«Цікава было пазмагацца супраць такіх «зорак» сусветнай вольнай барацьбы, як Кайл Дэйк і Франк Чаміза. І ўжо тым больш у іх выйграць. Цяпер трэба прагледзець, што было не так у фінале, і папрацаваць над памылкамі. Званне алімпійскага чэмпіёна для мяне — вяршыня ў спорце. Наперадзе Гульні ў Парыжы, будзем старацца», — падкрэсліў Магамедхабіб.

Ванеса Каладзінская стала ўладальніцай бронзавага алімпійскага медаля ў жаночай барацьбе. У паядынку за «бронзу» ў вагавой катэгорыі 53 кг беларуская спартсменка перамагла амерыканку Джакару Гвенішу Вінчэсцер.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў членаў нацыянальнай каманды па вольнай барацьбе з заваяваннем медалёў на Алімпійскіх гульнях у Токіа.

«У Токіа табе выпаў няпросты лёс, але ты ўпэўнена справіўся з моцным сапернікам. Цудоўную форму і волю да перамогі паказаў і ў фінальным паядынку, — гаворыцца ў віншаванні Магамедхабібу Кадзімагамедаву. — Упэўнены, што ў тваёй кар'еры будзе яшчэ шмат яркіх выступленняў і гучных перамог». Прэзідэнт пажадаў спартсмену моцнага здароўя, удачы і дабрабыту.





СТАР. 3

## КОРАТКА

- Колькасць заявак на ўдзел у «Вялікай размове з Прэзідэнтам» наблізілася да тысячы.
- **У Мінску адкрылі помнік народнаму артысту Беларусі Ігару Лучанку.**



- Чарговае пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі адбудзецца 11 жніўня.
- **«Беларусьфільм» будзе арганізатарам маючага адбыцца кінафестывалю «Лістапад».**
- Забарона на наведванне лясоў знятая на ўсёй тэрыторыі Беларусі.
- **Заолагі нанава адкрылі аднаго з самых рэдкіх хамелеонаў у свеце.**

Жніво-2021

# ГАСПАДЫНЬКІ ХЛЕБНАЙ НІВЫ

**Наколькі ўраджай залежыць ад смачных абедаў, высвятляла карэспандэнт «Звязды» ў Быхаўскім раёне**

**Сёння ўсе толькі і гавораць, што пра будучы хлеб ды пра камбайнераў. Маўляў, ад іх рук залежыць харчовая бяспека краіны. Ага, паглядзелі б мы на гэтых герояў, калі б яны працавалі нашча... Памятаеце добры савецкі фільм «Дзяўчаты»? Начальнік лесапункта Ігнат Васілевіч казаў так: «Харчаванне — такая ж асноўная работа, як і лесанарыхтоўкі. Не паабедалі лесарубы — і выпрацоўка адразу ўпала...» Разумееце, як тут усё ўзаемазвязана? Гледзячы па тым, што ўраджай год ад году ў Магілёўскай вобласці горшы не становіцца, на месцах працуюць таленавітыя гаспадыні. А ў СВФ «Лудчыцы», што ў Быхаўскім раёне, як падказалі мне знаўцы, распрацавалі, лічы, дамашняе меню.**



СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

21150

9 771990 763008

# «Усё, што мы ўзводзім і ўзмацняем — масты, дарогі, гарады, незалежнасць нашай дзяржавы, — павінна стаць асновай для будучых дасягненняў нашых дзяцей»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па сутнасці, аб'ект стаў самай маштабнай будоўляй абласнога цэнтра за апошнія гады. Рэканструкцыя пачалася ў 2019 годзе па прамым распараджэнні кіраўніка дзяржавы, сам аб'ект быў уключаны ў Дзяржаўную інвестпраграму. Яго кошт склаў каля 150 мільёнаў рублёў.

Гэта чацвёрты аўтамабільны мост праз Нёман у абласным цэнтры і адзін з самых высокіх у краіне — большы за 32 метры. У ходзе рэканструкцыі ён значна пашырыўся — з 4,5 метра да 17,5. Мост стаў чатырохпалосным, з шырокімі тратуарамі і веладарожкамі. Яго даўжыня — 240 метраў.

Новы аўтамабільны мост — гэта частка глабальнага праекта ў сферы дарожнага будаўніцтва рэгіёна і падарунак для жыхароў рэгіёна да гадавіны вызвалення Гродзеншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дарэчы, урачыстае адкрыццё мела адбыцца ў ліпені, якраз да даты вызвалення горада, але з-за моцных ліўняў і наступстваў стыхіі мерапрыемства перанеслі. Трэба адзначыць, што і гэтым разам надвор'е ў Гродне было даждлівае, з парывамі ветру, але адкладваць цырымонію не сталі.

«Сем гадзін было — патэлефанаваў губернатар. Ну, што будзем рабіць? Ён мне кажа: ведаеце, Аляксандр Рыгоравіч, нават калі будзе лівень сёння, трэба прыехаць і адкрыць Прэзідэнту гэты мост. Гэта будзе павага з боку Прэзідэнта гродзенцам. Тут мяне не пакідае думка: мудра ён паступіў, што ў чарговы раз не адклаў гэтую падзею. І я вельмі рады, што мне давялося пабываць на гэтым мосце», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт выказаў пажаданні, каб новы мост праз Нёман, які прайшоў некалькі выпрабаванняў на трываласць і вытрымаў удары стыхіі, стаў сімвалам захавання нацыянальнай памяці беларусаў, гісторыі і традыцый.

«Сёння нам выпала ўнікальная магчымасць аб'яднаць бясцэнны вопыт папярэдніх пакаленняў з найноўшымі тэхналогіямі сучаснай будаўнічай галіны. Усё, што ўзводзім і ўзмацняем — масты, дарогі, гарады, незалежнасць нашай суверэннай дзяржавы, — таксама павінна стаць асновай для будучых дасягненняў нашых дзяцей», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Нагадаем, што чыгуначны мост праз Нёман пабудаваны роўна 55 гадоў таму. Ён быў аднакалейны і прызначаўся для злучэння двух хімічных гігантаў горада — прадпрыемстваў «Гродна-Азот» і «Хімвалакно». Але паступова патрэба ў перавозцы грузаў па «калейцы» знікла, і саставы па ёй больш не хадзілі. Між тым аб'ект лічыўся стратэгічным і знаходзіўся пад аховай.

Другое жыццё Усходняга моста пачалося гадоў дзесяць таму. У гэты перыяд стаў весціся дэмантаж чыгуначнага палатна. Але сам мост так і стаяў на сваіх дзевяці апорах. А вось недзе два гады таму мясцовыя ўлады звярнулі ўвагу на гэты аб'ект. Прычым ідэя прыйшла падчас аблёту горада на верталёце. Мост добра разгледзелі і прыйшлі да высновы, што яго можна арганічна ўпісаць у склад вялікай кальцавой дарогі вакол Гродна. І тады можна будзе размеркаваць транспартныя патокі з паўднёвых мікрараёнаў Альшанка і Вішнявец у гістарычны цэнтр горада і паўночную яго частку.

Такая дарожная перспектыва невыпадковая. У горадзе актыўна ідзе забудова новых мікрараёнаў у розных яго частках. Комплексная праграма жыллёвага і дарожнага будаўніцтва прадугледжвае, між іншым, іх транспартнае злучэнне. Новае кальцо вакол горада павінна пачаць дзейнічаць праз 10 гадоў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## «ПЭЎНЫЯ ПРАБЛЕМЫ МЫ ПАВІННЫ БАЧЫЦЬ І ПАЗНАЧАЦЬ ЗАГАДЗЯ»

**Пра гэта пасля адкрыцця моста Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў падчас нарады ў Гродзенскім аблвыканкаме, паведамляе прэс-служба кіраўніка краіны.**

«Нягледзячы на тое, што лета было гарачым ва ўсіх адносінах, ніхто з нас не здымаў галоўны наш абавязак — працаваць і даваць вынік. Вы цудоўна ведаеце, шмат чулі ў тым ліку ад мяне пра тое, што адбываецца вакол Беларусі. Задачы пастаўлены, сістэма выбудавана ў Беларусі, а вось як яна рэалізуецца, на прыкладзе Гродзенскай вобласці мы ўбачым на гэтай нарадзе», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, нарада прысвечана негатыўным з'явам у рэгіёне, і краіне ў цэлым. «Магчыма, ёсць пэўныя праблемы. Мы іх павінны бачыць і пазначаць загадзя. Яны звязаныя з тым няспынным ціскам на Беларусь, перш за ўсё з пункту гледжання эканомікі», — сказаў Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што ўвесь час звяртае асаблівую ўвагу вертыкалі ўлады, урада на эканоміку. «Дайце вынік у эканоміцы. З усімі астатнімі пытаннямі, а яны не лягчэйшыя, мы справімся, — цытуе кіраўніка краіны яго прэс-служба. — Кіраўніцтва вобласці на месцы. Ёсць элемент ваенны, які ў асобе Юрыя Хаджымуратавіча (памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Юрый Караеў раней узначальваў МУС. — **«Зв».**) прайшоў гэтыя цяжкія часы ў самым пекле. Ёсць чалавек малады, арганізаваны, які ведае, што рабіць, і, як я бачу, робіць. Таму ні ў якім разе не трэба расслабляцца, і ўсё ў нас атрымаецца».

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік у пачатку нарады далажыў аб ходзе ўборачнай кампаніі ў рэгіёне, развіцці сельскай гаспадаркі і аграпрамысловага комплексу — адзначаецца рост экспарту, што сведчыць аб запатрабаванасці прадукцыі на знешніх рынках.

Блізкая ўлада

# РАЗАБРАЦЦА І ДАПАМАГЧЫ

## Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла прыём грамадзян у сталіцы

**У рамках адзінага дня прыёму грамадзян сенатарамі, які ўжо становіцца традыцыйнай формай работы, сустрэцца і расказаць ім аб сваіх турботах і праблемах пажадала больш за трыста чалавек. Большасць заяўнікаў, як звычайна, запісалася на прыём да спікера верхняй палаты парламента: паведаміць асабіста пра тое, што хвалюе, выказалі намер 196 заяўнікаў.**



Безумоўна, сустрэцца з усімі ў адзін дзень Наталля Качанава фізічна наўрад ці змагла б. Аднак гэта не значыць, што чыясці праблема застанецца па-за ўвагай заканадаўцаў: абавязкова ўсе заявы будуць узятыя на кантроль, а наступны прыём сенатарамі, як анансавала Старшыня Савета Рэспублікі, пройдзе таксама ў сталіцы. І каб не адкладваць гэтую падзею, як кажуць, на доўгі час, наступную сустрэчу яна запланавала правесці ў верасні.

Аднак вернемся да цяперашніх клопатаў мінчан. З якімі праблемамі яны прыйшлі да Наталлі Качанавай?

Цёзку спікера Савета Рэспублікі — шматдзетную маці Наталлю, якая нарадзіла шасцярых дзяцей і ўзнагароджана ордэнам Маці — хвалявала адразу некалькі пытанняў. Па-першае, яна пажалілася на неканчаткова праведзены разлік папярэднім наймальнікам яе мужа-кіроўцы, які працаваў з 2015 да 2020 года па найму. «Шэрыя» схемы выплаты заробкаў у канверце і махлярства з налічэннем «камандзіровачных», перакананая жанчына, павінны быць ліквідаваны. Сям'я звярталася і ў дэпартамент па працы, і нават у суд. У апошняй інстанцыі з-за прапушчаных тэрмінаў заяву не разглядалі, а вось дэпартамент знайшоў парушэнні ў разліках. Жанчына просіць прыспешыць дадзены працэс.

Па-другое, Наталля Анатолеўна прасіла спікера Савета Рэспублікі як упаўнаважаную Прэзідэнта па горадзе Мінску паўплываць на здачу дома для шматдзетных у новым мінскім мікрараёне Чыжоўка-6А — маўляў, дом пабудаваны і пафарбаваны, а ключы забудоўшчык не аддае: хутка адпраўляць дзяцей у школу, а як, калі людзі тут яшчэ не жывуць і няма рэгістрацыі?! Трэба сказаць, што сям'я пакуль жыве ў вёсцы пад Мінскам, а ў сталіцы іх чакаюць дзве двухпакаёвыя кватэры ў доме па вуліцы Карзюкі.

Спікер Савета Рэспублікі запэўніла, што ні адна з узнятых тэм не застанецца па-за ўвагай улады, і даручыла кампетэнтным органам падключыцца да вырашэння агучаных жанчынай праблем.

Мінчанку Алесю Мікалаеўну турбавала праблема даўгабуда на вуліцы Купрэвіча, які ўзводзіць Мінскі домабудаўнічы камбінат. У прыватнасці, некалькі разоў пераносіліся тэрміны здачы дадзенага дома з прычыны прасадкі фундамента і з'яўлення трэшчын на сценах. Многія дольшчыкі, якія ўжо цалкам разлічыліся з забудоўшчыкам за свае кватэры, не вытрымалі выпрабавання часам і вырашылі скасаваць дагаворы і вярнуць свае грошы. Але, як высветлілася, не ўсё так проста. Разлічыцца адразу з усімі жадаючымі забудоўшчык не можа, людзі чакаюць і нервуюцца.

Як пастлумачыў **першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Дзмітрый МІКУЛЁНАК**, які прысутнічаў на прыёме, з прыблізна сотні тых, хто заключыў дагавор на долевае будаўніцтва, ужо адмовіліся ад кватэр па гэтым адрасе, з 65-цю разлічыліся, а 34 сям'і яшчэ чакаюць разліку. Разам з тым, дом рыхтуецца да здачы ў эксплуатацыю, на вызваленыя кватэры цяпер шукаюць ахвотных іх набыць.

— Людзям грошы павінны вярнуць у тыя тэрміны, што абяцалі, — выказала безапеляцыйную пазіцыю Наталля Качанава. — Гэта мае даручэнне Кухараву (старшыні Мінгарвыканкама. — **Заўв. аўт.**) Па-другое, трэба ліквідаваць недахопы, каб дом быў уведзены ў эксплуатацыю ў нармальным стане.

Таму дадатковае даручэнне было дадзена «Дзяржбуднагляду»: правесці праверку якасці будаўнічых работ сумесна з Міністэрствам будаўніцтва і архітэктуры. Акрамя таго, паставіць пытанне на асаблівы кантроль у адміністрацыі Фрунзенскага раёна сталіцы.

Жыхарку гэтага ж раёна Наталлю Мікалаеўну з вуліцы Альшэўскага турбавала пытанне суседства: у іх жылым доме, пабудаваным яшчэ ў 1966 годзе, на першым паверсе з'явіўся арандатар, які аказвае фізкультурна-аздараўленчыя паслугі насельніцтву. Усё б нічога, каб не бразганне «жалеза» разам з біццём спартыўным інвентаром па сценах — гэтыя шумы перашкаджаюць людзям спакойна жыць і паўнавартасна адпачываць.

Дарэчы, мясцовы цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, які рабіў замеры шуму, зафіксаваў яго перавышэнне. Шумаізаляцыю нібыта зрабілі, але людзей яе вынік не задавальняе.

Як патлумачыў **кіраўнік адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска Сяргей ШКУДНЕЎ**, памяшканне знаходзіцца ў камунальнай маёмасці і арандуецца прыватнікам. Спікер Савета Рэспублікі прапанавала знайсці яму іншае прыдатнае памяшканне пад згаданыя мэты, а побач з кватэрамі пашукаць кандыдата аказваць паслугі больш спакойнага характару: ад цырульні да прадуктовай крамы.

Фактычна заканадаўчую калізію агучыла маладая мінчанка Анастасія, якая прыйшла на прыём да Наталлі Качанавай з немаўляткам на руках. Яе сыну ўжо тры месяцы, але жанчына не можа яго зарэгістраваць у кватэры, дзе жыве сама, наймальнікам якой з'яўляецца яе маці. Як расказалі спецыялісты, калі статус жылля з'яўляецца сацыяльным, то ёсць абмежаванні па рэгістрацыі, згодна з жыллёвым заканадаўствам.

— Так быць не павінна! Дзеці павінны быць зарэгістраваныя разам з бацькамі, — перакананая Наталля Качанава і дадала: — Калі існуе заканадаўчая калізія — трэба змяняць заканадаўства, на тое мы і праводзім прыёмы грамадзян, каб ведаць аб такіх сітуацыях.

Спікер верхняй палаты парламента даручыла тэрмінова разабрацца ў агучаным пытанні, а адміністрацыі раёна — не чакаць, пакуль праблема будзе канчаткова вырашана на заканадаўчым узроўні, зарэгістраваць малое разам з маці.

Каменціруючы журналістам вынікі прыёму грамадзян, Наталля Качанава падкрэсліла, што адзіны дзень прыёму як форма работы сенатараў абраны невыпадкова: гэта дае дакладнае ўяўленне аб тых праблемах, з якімі сутыкаюцца жыхары таго ці іншага горада, раёна, вобласці. У дадзеным выпадку гэта сталіца, і сёння, 7 жніўня, пытанне работы мясцовых органаў улады будзе разгледжана на пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі.

— Пытанняў дастаткова шмат. Перш за ўсё яны датычацца будаўніцтва жылля, якасці яго ўзвядзення — гэта вельмі важныя пытанні, якія хвалююць жыхароў Мінска, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Мы пастараемся разабрацца ва ўсіх.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота БелТА.**

### У тэму

**Члены Савета Рэспублікі ў рамках адзінага дня прыёму грамадзян таксама далучыліся да работы са зваротамі.**

Так, намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА працаваў са зваротамі грамадзян у адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ — у адміністрацыі Заводскага раёна, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ — у адміністрацыі Савецкага раёна, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ — у адміністрацыі Кастрычніцкага раёна, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ — у адміністрацыі Маскоўскага раёна.

# УСЯ АЛІМПІЯДА — БАРАЦЬБА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У віншаванні Ванэсе Каладзінскай беларускі лідар падкрэсліў: «У жорсткай канкурэнцыі табе ўдалося пакарыць гэты высокі п'едэстал. Тваё выступленне — несумненны поспех, а бліскучая перамога ў паядынку за «бронзу» — яркае сведчанне таленту». Аляксандр Лукашэнка пажадаў Ванэсе Каладзінскай моцнага здароўя, аптымізму і новых дасягненняў на карысць роднай Беларусі.

Асаблівыя словы ўдзячнасці кіраўнік дзяржавы адрасаваў трэнерам і ўсёй нацыянальнай камандзе па вольнай барацьбе. «Вы высока пранеслі сцяг Рэспублікі Беларусь на галоўным спартыўным форуме планеты. Дзякуй вам за працу, вытрымку і дастойны вынік»,

**ВЕСЛАВАННЕ НА БАЙДАРКАХ І КАНОЭ.** Мужчынская байдарка-чацвёрка з Беларусі кваліфікавалася ў паўфінал Алімпіяды. У чвэрцьфінале Мікіта Борыкаў, Уладзіслаў Літвінаў, Ілья Федарэнка, Дзмітрый Натынчык фінішавалі другія. Надзея Макарчанка і Дарына Пікулева выйшлі ў паўфінал Алімпійскіх гульняў гонак каноэ-двоек на дыстанцыі 500 м. Беларуская жаночая байдарка-чацвёрка ў складзе Вольгі Худэнкі, Марыны Літвінчук, Маргарыты Махневай і Надзеі Папок таксама выйшла ў паўфінал спаборніцтваў на 500 метраў.

**СУЧАСНАЕ ПЯЦІБОР'Е.** Беларуския спартсменкі няўдала выступілі ў індывідуальным алімпійскім турніры па сучасным пяцібор'і. Па выніках двух спаборніцкіх дзён Анастасія Пракапенка набрала 1342 балы і заняла 8-е месца, у Вольгі Сілкінай 1292 балы і 18-я пазіцыя ў выніковым пратаколе. У мужчынскім індывідуальным турніры беларускі атлет Ілья Палазкоў пасля першага віду спаборніцтваў — фехтавання — займае 3-е месца, набраўшы 244 ачкі. Алімпійскія прызёры ў мужчын вызначацца ў суботу.

**ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА.** Дзмітрый Дзюбін у спаборніцтвах па спартыўнай хадзьбе на 50 кіламетраў з вынікам 4 гадзіны 00 хвілін 25 секунд заняў 22-е месца. Гэта найлепшы вынік спартсмена ў сезоне. А лёгкаатлетычныя спаборніцтвы працягнуцца марафонам, дзе Беларусь прадстаўляць дзве спартсменкі. Вольга Мазуронак, шматразовая рэкардсменка краіны, усяму свету паказала сваю моц і сілу духу на чэмпіянаце Еўропы 2018 года ў Берліне. Тады ёй нішто не перашкодзіла — ні моцны крывацёк, ні пропуск патрэбнага павароту. А кадры яе гераічнай перамогі яшчэ доўга бударажылі інтэрнэт. Алімпійскі марафон будзе пакараць і Ніна Савіна, пераможца Кубка Еўропы ў бегу на 10 000 метраў, пераможца Мінскага паўмарафону 2019 года.

**МАСТАЦКАЯ ГІМНАСТЫКА.** Па выніках выступленняў у кваліфікацыі індывідуальнага мнагабор'я Аліна Гарнасько набрала 99,250 бала і заняла 4-е месца. Адразу ўслед за ёй размясцілася Анастасія Салас, у якой 99,150 бала. А ў суботу сваё выступленне пачнуць групы. Беларускі Настасся Малаканава, Настасся Рыбакова, Ганна Гайдукевіч, Арына Цыцыліна і Карына Ярмоленка не стамляюцца збіраць узнагароды з самых розных турніраў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### ❍ У ТЭМУ

**Афіцыйная заява НАК Беларусі аб рашэнні дысцыплінарнай камісіі МАК.**

Нацыянальны алімпійскі камітэт выступіў з афіцыйнай заявай з нагоды рашэння дысцыплінарнай камісіі Міжнароднага алімпійскага камітэта, што датычыцца беларускіх трэнераў, паведамілі ў прэс-службе НАК.

Нагадаем, што 5 жніўня дысцыплінарная камісія Міжнароднага алімпійскага камітэта прыняла рашэнне аб пазбаўленні акрэдытацыі на Гульнях XXXII Алімпіяды ў Токіа трэнераў беларускай каманды па лёгкай атлетыцы Юрыя Маісевіча і Артура Шумака. У заяве МАК адзначаецца, што гэта часовыя меры. На дадзены момант працягваецца працэс разбору па сітуацыі.

Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь пацвярджае дадзеную інфармацыю, і ў найбліжэйшы час трэнеры вернуцца ў Мінск. Разам з тым мы пакідаюць за сабой права абскардзіць дадзенае рашэнне. «У сваю чаргу, НАК Беларусі па-ранейшаму адкрыты для працягу дыялогу і знаходзіцца ў цесным супрацоўніцтве з МАК для высвятлення ўсіх абставін прынятага рашэння. НАК Беларусі ў поўнай меры адстойвае і будзе далей абараняць інтарэсы ўсіх беларускіх атлетаў і трэнераў ад любых формаў дыскрымінацыі пры наяўнасці такіх», — сказана ў заяве.

Шок

# ЗАГІНУЛАМУ БЫЛО НАНЕСЕНА НЕ МЕНШ ЗА 30 УДАРАЎ

## Сталі вядомыя жудасныя падрабязнасці смерці грамадзяніна Ірака

**Беларускія спецыялісты назвалі гемарагічны шок, які быў выкліканы вялікай стратай крыві, прычынай смерці мігранта з Ірака на беларуска-літоўскай граніцы. Пра гэта паведаміў тэлеканал «Беларусь 1» са спасылкай на даныя беларускіх судовых медыцынскіх экспертаў.**




«На дадзены момант можна сказаць, што намі ўжо вызначана прычына смерці, колькасць пашкоджанняў, якія былі прычынены грамадзяніну Ірака, — адзначыў у тэлеэфіры **галоўны дзяржаўны судова-медыцынскі эксперт Беларусі Юрый АЎСІЮК.** — Магу сказаць, што іх было не менш за 30. Гэта шырокія сінякі на верхніх, ніжніх канечнасцях, пераломм рабра. Сінякі настолькі вялікія, што яны суправаджаліся разбітай падскурна-тлушчавай абалонкай, фарміраваннем міжмышачных гематом. У канчатковым выніку прычына смерці — гемарагічны шок, які выклікала вялікая страта крыві за кошт дэпаніравання яе ў мяккіх тканках. Нашымі ж біёлагамі і генетыкамі на працягу ночы былі праведзены даследаванні, якія дазволілі стапрацэнтна вызначыць, што біялагічны матэрыял, гэта значыць кроў, якая была знойдзена на месцы здарэння, адпавядае крыві дадзенага чалавека. Дзякуючы гэтаму следству будзе лягчэй устанавіць усю карціну таго, што адбылося, і яго рух ад моманту перасячэння граніцы да моманту выяўлення. Калі казаць пра пашкоджанні, то ўсе яны прычыненыя цвёрдымі тупымі прадметамі, у тым ліку і прадметамі прадаўгаватай формы, да якіх адносяцца палкі, магчыма, спецсродкі, дубінкі. Пашкоджанні нанесены з вялікай сілай. З улікам практыкі магу сказаць, што яны ўжываліся людзьмі, якія ведалі, куды біць. Няма пашкоджанняў жыццёва важных органаў, галавы, у асноўным яны сканцэнтраваныя на канечнасцях. Яны маюць такі шырокі выгляд, што і стала прычынай смерці».

Тым часам стала вядома, што літоўская паліцыя пачала папярэдняе следства па факце пагрозы праявядзення тэрарыстычных актаў. Пра гэта паведаміў Дэпартамент паліцыі пры МУС краіны. «Следства заведзена па факце тэрарыстычнай пагрозы пасля атрымання сродкамі масавай інфармацыі па электроннай пошце паведамлення аб мініраванні 12 аб'ектаў у сталіцы Літвы», — адзначыў дэпартамент. У лісце гаворыцца пра тое, што выбухі будуць помстай за «братоў-мусульман», гэта значыць нелегальных мігрантаў з краін Азіі і Афрыкі, якіх Літва пачала выштурхоўваць у Беларусь. Сярод 12 аб'ектаў былі ўказаныя буйныя гандлёвыя цэнтры, бізнес-цэнтры, Дэпартамент міграцыі пры МУС Літвы і іншыя будынкі. Яны былі правераныя паліцыяй. Нічога падазронага не выяўлена.

Прадстаўнік Службы аховы дзяржграніцы Літвы Рокас Пукінскас у размове з Бі-бі-сі адмовіўся каменціраваць паведамленні пра ўжыванне сілы з боку літоўскіх памежнікаў, але пацвердзіў факт вяртання мігрантаў у Беларусь. «Мы вывучаем сітуацыю. Мы вывучаем прававыя акты. Мы дзейнічаем у рамках аперацыйнага плана», — сказаў, у сваю чаргу, прэс-сакратар агенцтва Frontex Пётр Світальскі. Ён таксама заявіў, што Frontex ніяк не ўдзельнічае ў дзеяннях па вяртанні мігрантаў у Беларусь. Паводле яго слоў, у пятніцу прыбылі назіральнікі за выкананнем базавых правоў чалавека — штатныя супрацоўнікі Frontex.

Рашэнне аб высылцы мігрантаў актыўна каменціруюць літоўскія палітыкі. Яно парушае нормы міжнароднага права, напісаў у Facebook кіраўнік Камітэта па правах чалавека ў Сейме Літвы Томас Вітаўтас Раскявічус. «Мы ходзім па тонкім лёдзе», — лічыць дэпутат. Літоўскі палітык, экс-дэпутат гарсавета Клайпеды Вячаслаў Цітоў паведаміў тэлеканалу «Беларусь 1», што «ўлада Літвы сама загнала сябе ў кут і шукае рашэнні ў сілавых метадах. На жаль, пакуль усе незаконныя дзеянні Літвы сыходзяць з рук. Прытым, што міжнароднае права парушылася ўжо неаднойчы».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэм'ер Сэнт-Вінсэнт і Грэнадыны атрымаў раненне падчас акцыі пратэсту



Прэм'ер-міністр Сэнт-Вінсэнт і Грэнадыны (дзяржава ў Карыбскім моры) Ральф Гансалвеш атрымаў раненне галавы падчас дэманстрацыі пратэсту ў сталіцы і шпіталізаваны. Аб гэтым паведаміў мясцовы інтэрнэт-партал NEWS 784 са спасылкамі на ўлады. На прэм'ера напалі ў сталіцы Кінгстаўне, калі ён выйшаў з аўтамабіля і праходзіў міма пратэстуючых супраць абавязковай вакцынацыі, якія заблакавалі ўезд у будынак парламента. У Гансалвеша кінулі нейкі прадмет, які трапіў яму ў галаву, пасля чаго палітык быў шпіталізаваны з моцным крывацёкам. Паліцыя ўжо затрымала жанчыну па справе аб замаху на прэм'ер-міністра краіны. Па паведамленні ўлад, кіраўнік урада аднаўляецца пад наглядам персаналу бальніцы, дзе застанецца на ноч для назірання. Для далейшага лячэння яго даставяць у Барбадас. Сам Гансалвіш паведаміў, што ўжо пайшоў на папраўку.

### У Іспаніі арыштавалі кіраўніка італьянскай мафіі «Ндрангета»

Як абвясцілі праваахоўныя органы Іспаніі і Італіі, Даменіка Павільяціні быў затрыманы на вуліцы ў Мадрыдзе. Паліцыя лічыць, што менавіта гэты чалавек узначальвае клан « Ндрангета». Гэтая мафія базуецца ў Калабрыі, на самым поўдні італьянскага «бота», але дзейнічае далёка за межамі Італіі. Эксперты лічаць, што менавіта гэта злачынная групоўка ўвозіць у Еўропу большую частку какаіну, і ацэньваюць яе штогадовы прыбытак у 50 мільярдаў еўра. Павільяціні адшукваўся за злачынствы, учыненыя яшчэ ў 1980-х і 1990-х. Упершыню ён быў арыштаваны — таксама ў Іспаніі — у 1996-м. Праз тры гады яго экстрадавалі ў Італію, дзе ён быў асуджаны да пажыццёвага зняволення, але ў 2019-м адвакаты знайшлі памылку ў матэрыялах суда, справа была перагледжана, «боса босаў» выпусцілі з турмы, і ён збег у Іспанію. Павільяціні затрымалі ў выніку сумеснай аперацыі італьянскіх і іспанскіх сышчыкаў. Пры ім знайшлі шэсць мабільных тэлефонаў, амаль шэсць тысяч еўра наяўнымі і падробленыя партугальскія дакументы.

### Археолагі знайшлі 2400-гадовую садавіну ў егіпецкім затопленым горадзе



Плеценыя кошыкі, напоўненыя садавінай, адшукалі на месцы старажытнага патанулага горада Тоніс-Гераклеён каля ўзбярэжжа Егіпта, паведаміла CNN. Археолагі знайшлі рэшткі грэчаскага кургана, які мае даўжыню каля 60 метраў і шырыню 8 м і выглядае як свайго роду востраў, акружаны каналамі. Гэта адкрыццё пацвярджае прысутнасць грэчаскіх гандляроў і наймітаў у Тоніс-Гераклеёне, дзе яны пабудавалі свае ўласныя святыні побач з масіўным храмам Амона. У выяўленых плеценых кошыках знаходзіліся вінаградныя костачкі і плады афрыканскай пальмы, якія часта сустракаюцца ў магільнях. Таксама падчас экспедыцыі ў іншым раёне горада археолагі знайшлі затопленую старажытную галеру, якая была прышвартавана недалёка ад храма і затанула падчас яго разбурэння. Як вядома, у старажытнасці Тоніс-Гераклеён быў найбуйнейшым міжземнаморскім портам. У выніку некалькіх землятрусаў і цунамі ён разам з горадам Канопус апынуўся цалкам затопленым.

# ГАСПАДЫНЬКІ ХЛЕБНАЙ НІВЫ

## 50 КАПЕЕК ЗА ВЯЧЭРУ

Гаспадарка ў некалькіх кіламетрах ад Быхава, дабрацца да яе дапамагла **старшыня Быхаўскай раённай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў АПК Валянціна ГІРЫЛОВІЧ.** — Як толькі пачынаецца вясенне-палявы сезон, сталовыя кормяць механізатараў і паляводаў непасрэдна ў полі, — азнаёміла з нюансамі яна. — Найперш правяраецца абсталяванне сталовых, іх работнікі праходзяць медыцынскую камісію, афармляюцца ўсе неабходныя дакументы. Потым мы разам з санкамісіяй аб'язджаем гаспадаркі і даём допускі. Кошт абедаў у розных гаспадарках залежыць ад таго, што прапісана ў калдагаворы. Прадугледжаны зніжкі ад 50 працэнтаў да 100. У Абідавічах, напрыклад, людзей кормяць бясплатна. А нагул паўнавартасны абед са зніжкамі каштуе ад 70 капеек да рубля дваццаці, а вячэра — ад 50 капеек да 90.

У Быхаўскім раёне на дзесяць гаспадарак працуюць восем сталовых. Адна гаспадарка заключыла дагавор з райспажыўкааперацыяй, а другая — з суседняй гаспадаркай.

— Меню калгасніка строга залежыць ад тых прадуктаў, якія можна выкарыстоўваць у рабоце, — дзеліцца тонкасцю справы суразмоўніца. — Смакаты накшталт таго ж халадцу або маласольных агуркоў вы там не знойдзеце. Усё павінна быць сертыфікавана і прайсці санправерку. За самадзейнасць можна атрымаць штраф. Але нашы кухаркі вынаходлівыя і простыя стравы атрымліваюцца ў іх вельмі смачныя.

## 30 ЛІТРАЎ СУПУ І БІТОН КАТЛЕТ

Калгасная сталовая ў аграгарадку Лудчыцы — адна з самых сучасных. Нават дызайн тут асаблівы. Драўляныя сцены і высокія столі з бэлькамі, святлодыёдныя лямпачкі. Сталы і лаўкі з натуральнага дрэва. А ў двары па перыметры — утульныя альтанкі з бярвення. Гэты комплекс нават язык не паварочваецца сталовай назваць — хутчэй, кавярня. Кухня таксама светлая і прасторная. Кухараць тут дзве родныя сястры — **Алена КАДУШКІНА і Ганна ПІЛІПЕНКА.** Абедзве, дарэчы, шматдзетныя маці. У Ганны — пяць дзяцей, у Алены — трое і на дваіх — ажно 15 унукаў. І гэта нягледзячы на тое, што абедзвюм жанчынам крыху за 50. Алена прызнаецца, што ў выхадныя, бывае, дадому з'язджаецца да 17 чалавек. Але дочкі і нявесткі гатуюць самі, разумеюць, што іх маці цяпер на адказным месцы. На кухні Алена і Ганна ўжо з паловы восьмай. Пад паўдня ўсё павінна быць гатова.

Гляджу, як спрытна завіхаецца каля пліты Ганна і як апетытна выглядае ў яе на патэльні курыныя кумпячкі, і радуюся: якіх жа прафесіяналаў рыхтуе наша прафтэхадукацыя! Ганна смяецца і кажа, што дыплома кухара ў яе няма, яна — самавучка. А вось старшая па кухні Алена закончыла Магілёўскае кааператыўнае прафесійна-тэхнічнае вучылішча.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Вось мы суп гарохавы ўжо прыгатавалі, — паднімае Алена вечка 30-літровай каструлі. — Гатуем усё, што нашы мужчыны любяць. Сёння, напрыклад, зрабілі іх любімы гарохавы суп, у іншыя дні варым на першае і капусту, і суп з макаронай — стараемся не паўтарацца. Гарохавы суп, дарэчы, не з


Кіроўца-тысячнік Віктар ЧУХМАНАЎ сведчыць, што ад абедаў «палявых» гаспадыньк нават працуецца весялей.

брыкетаў. Мяса кладзём з разліку 50 грамаў на чалавека, а на другое мясного ідзе па 150 грамаў. Сёння, напрыклад, будзе макарона з катлетамі. На трэцяе — малінавы кісель.

З абсталявання на кухні вялікая электрычная пліта з духоўкай, электрычная мясарубка, паверхня для разагрэву, на зале — мікрахвалеўка. Ёсць электрачайнік, посуд пакрысе дакупляецца. З механізаванымі і электрычнымі памочнікамі сціпла. Прыходзіцца ўручную і бульбу чысціць, і посуд мыць, і прадукты рэзаць, крышыць, мясіць, перабіраць. А аб'ёмы немаленькія. Кожны дзень сёстры гатуюць па 40 абедаў і 20 вячэр.

— На дзень ідзе амаль восем кілаграмаў мяса, — загінае пальцы Алена. — Сем кіло чорнага хлеба, чатыры — батонаў, тры кіло макароны, паўтара кілаграма цукру — усё залежыць ад колькасці людзей. Абслугоўваем механізатараў і паляводаў. Рыбу смажым, катлеты, «адбіўнушкі»


Абед у полі.

робім, кумпячкі, галёнкі курыныя, тэфтэлі. Стараемся, каб была разнастайнасць.

Сёстры цягаюць 30-літровыя каструлі, але не скардзяцца.

— Я прыходжу на работу і думаю не пра тое, як мне цяжка, а пра тое, што зварыць нашым хлопцам, — кажа Ганна. — Які супчык прыгатаваць, каб дагадзіць. Каб было нешта навенькае, свежанькае. Прафесія кухара, хоць я і без дыплома, мне вельмі падабаецца. Гэта адназначна маё. Мне як гаспадыні прыемна, што мужчыны нашы сытыя, бо ядуць смачна і порцыі мы даём такія, што і дабаўкі прасіць не трэба. Расказваюць нам, што нават жонак просяць навахрыць такога гарохавага супу, які робім мы.

Мне таксама налілі талерку супу, каб ацаніла. Суп сапраўды фірменны — смачны, густы, наварысты. На другое ў мяне нават ужо і сіл не хапіла.

Спрабую выведаць рэцэпты смачных страў, але сёстры толькі адмахваюцца і смяюцца. Кажуць, што гэтыя рэцэпты знаёмыя ўсім. Толькі ў розных людзей усё роўна ўсё па-рознаму атрымліваецца. Як казала Тося Кісліцына: «Вінаватая хіба я, што ў мяне капуста смачная? Я проста вару і каштую на смак, салю ў меру і цыбулі для заправы не шкадую. Гэтак кожны здолее, былі б прадукты».

— Мы з душой гатуем, як для сябе, — усміхаецца Ганна. — І ставаемся гарачанькае развезці. І гэта прытым, што адлегласці не маленькія — да 40 кіламетраў: Верхняя Тошчыца, Істопкі, Чырвоны Бераг — аб'язджаем усе палі. І ўсюды трэба мінімум 20 хвілін пастаяць, пачакаць, каб чалавек паеў. Настрой падтрымаць. Не, любімчыкаў няма. Яны дома ёсць, а на рабоце ўсе мужыкі добрыя.


Ганна і Алена — кухары ад Бога.

— Нашы дзяўчаты на сваім месцы, — перакананы **дырэктар СВФ «Лудчыцы» Віталь СТАНКЕВІЧ,** які на хвілінку заглянуў у сталовую. — Мне ўсе іх стравы падабаюцца, асабліва катлеты. Тут можна так пад'есці, што потым яшчэ суткі не будзеш хацець. А нашы гаспадынькі яшчэ і ў гумары заўсёды, іншых на дабро зараджаюць.

Віталь Станкевіч прызнаўся, што сытны абед — адзін са складнікаў добрага ўраджаю. Такі ж важны, як якаснае насенне і апрацоўка поля.


Алена: «Гатуем тое, што любяць нашы хлопцы».

## ПЕРАСОВАЧНАЯ КУХНЯ

Да сталовай пад'язджае сіняя «газель» — і пачынаецца пагрузка. Па саннормах, акрамя ўмывальніка, павінны быць сродкі для апрацоўкі рук. Усё ж такі каранавірус ніхто не адмяняў. Усё неабходнае грузіцца ў салон разам са сталом і лаўкамі. Потым туды ж адпраўляюцца ёмістыя каструлі з ежай. За рулём мікрааўтобуса — кіроўца Юрый Навікаў. Прызнаецца, што за дзень прыходзіцца «накручваць» на дастаўцы абедаў і вячэр да 300 кіламетраў.

На гадзінніку 12.00, машына разам з кухарам адпраўляецца ў поле. Ганна ў лёгкай хустачцы і сукенцы з фартухом чымсьці нагадвае экранную кухарку. Яна адказвае за дастаўку абедаў у поле. Яе галоўная задача — каб ніхто не застаўся галодны. Некалькі кіламетраў па пыльнай дарозе, якая пятляе сярод кукурузных і збожжавых плантацый, і мы на месцы — ва ўрочышчы Стараселле, дзе на плошчы 42 гектараў убіраюць ячмень. Мікрааўтобус прыпыняецца ў чыстым полі, і да машыны пачынаюць падцягвацца МАЗы і камбайны. Хутка вакол палявой кухні становіцца ажыўлена. Мужчыны мыюць рукі і становяцца ў чаргу па смачны суп. Пах яго апетытна разносіцца па полі.


Вячэра гатуецца зранку.

«А з дома «тармаскі» бераце?» — спрабую высветліць, пакуль камбайнеры і кіроўцы не разбегліся: час такі, што ім не да інтэрв'ю. «Якія «тармаскі»? Навошта?» — не разумеюць яны мяне. Агульная адзнака, як у тых жа «Дзяўчатах»: «Капуста — ВО! Рагу, як у санаторыі. Кожная калорыя на сваім месцы».

— А што больш падабаецца?

— Усё, — кажуць мужчыны. — Кормяць нас, паверце, добра.

— Пад'ём сіл адчуваеце пасля абеду?

— Вядома, — усміхаецца **кіроўца-тысячнік Віктар ЧУХМАНАЎ.** — Вунь, тысячу тон зернебабовых перавёз. Дзякуй нашым дзяўчатам, кормяць да адвалу.

— Наядаюся так, што і пасля работы есці не хачу, — прызнаецца кіроўца Юрый. — Вось абед быў, а не паспееш азірнуцца — і вячэру прывязуць.

— Кухня вельмі падабаецца, — пацвердзілі **камбайнер Міхаіл ЛАЦАПНЁЎ** і яго **памочнік Андрэй БАГАМАЗАЎ.** — Усё смачна.

— У нас цудоўная сталовая, — адзначыў **дырэктар «Быхаўрайаграпрамтэхснаба» Сяргей СІЎЧЫКАЎ,** які прыехаў на поле па вытворчых справах. — Арганізавана двухразовае харчаванне і ажыццяўляецца падвоз. Прадукты своечасова купляем у «Белспажыўкааперацыі». Часткова выкарыстоўваем мяса, вырашчанае ў сваёй гаспадарцы. Усе задаволеныя. І працуюць з аддачай. Да 15 жніўня плануем уборачную завяршыць.

Валянціна ГІРЫЛОВІЧ, старшыня Быхаўскай раённай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў АПК, адзначае:

— Сёлета і надвор'е, здаецца, нядрэннае, але ўраджай крыху горшы, чым летась. На раніцу 4 жніўня было ўбрана 48 % збожжавых і зернебабовых. Па тэмпах уборкі лідзіруе гаспадарка «Новабыхаўскі». На раніцу 4 жніўня ў нас было шэсць экіпажаў камбайнераў-тысячнікаў і восем вадзіцеляў, якія перавезлі больш чым тысячу тон збожжа. Усіх тысячнікаў і двухтысячнікаў ушаноўваем невялікімі, але каштоўнымі падарункамі, і даём зорачку на машыну за кожную тысячу. Сёлета раён атрымаў шэсць новых камбайнаў «Палессе», праблем з тэхнікай няма. Нашы камбайнеры цяпер не любяць даваць інтэрв'ю, бо падлічваюць у галаве, колькі б змаглі за гэты час намалаціць. Нават снедаюць на хаду. Выскачылі, паелі і паехалі.

*Нэлі ЗІГУЛЯ,*
*Быхаўскі раён.*
*Фота аўтара.*

Энергетыка

# «ЭЛЕКТРЫЧНЫЯ» ЖАДАННІ І МАГЧЫМАСЦІ

## Беларусы хочуць электрыфікаваць жыллё, але прыйдзецца чакаць

**Збудаваць каля 2 млн м² электрадамоў плануецца ў Беларусі да 2025 года, што, як разлічваюць эксперты, павялічыць гадавое ўжыванне электраэнергіі на гарачае водазабеспячэнне, ацяпленне і гатаванне ежы на 0,22 млрд кВт·г. Сёлета выказалі жаданне перайсці з пячнога ацяплення на электрычнае жыхары 78 існуючых шматкватэрных дамоў, а таксама больш як 13 тысяч уладальнікаў прыватных сядзіб у сельскай мясцовасці. Пры гэтым, каб кожны беларус мог ужо цяпер карыстацца электраэнергіяй, у рэканструкцыю электрасетак неабходна ўкласці 28 млрд рублёў, ці 11 млн долараў, прыцягнуць якія адначасова немагчыма. Як краіна плануе павялічваць выкарыстанне электраэнергіі ў дамах, каму і колькі грошай вернуць за расходы на забеспячэнне жылля электраўстаноўкай, і што гэта дасць беларусам увогуле, — расказалі эксперты.**



### 40 % І 80 «БАЗАВЫХ», 20 % І 20 «БАЗАВЫХ»

Чатыры асноўныя мерапрыемствы па выкарыстанні электраэнергіі для гарачага водазабеспячэння, ацяплення і гатавання ежы вызначаны для жыллёвага фонду Беларусі. Гэта будаўніцтва шматкватэрных, аднакватэрных і блакіраваных дамоў з выкарыстаннем электраэнергіі на дадзеныя патрэбы; перавод шматкватэрных дамоў з пячнога ацяплення на электрычнае; перавод шматкватэрных дамоў, падключаных да рэзервуарных установак звадкаванага газу (у краіне такія ёсць у 268 населеных пунктах), на выкарыстанне электраэнергіі. Такое мерапрыемства новае і пакуль абмяркоўваецца, якім чынам яно будзе рэалізоўвацца. А таксама перавод аднакватэрнага і блакіраванага жылля на выкарыстанне электраэнергіі для гатавання ежы, гарачага водазабеспячэння і ацяплення, паведаміў **Андрэй НЯГОДЗЬКА, начальнік упраўлення стратэгічнага развіцця «Белэнерга»:**



*— Цікавасць у грамадзян да выкарыстання электрычнасці на ацяпленне, гатаванне ежы і гарачае водазабеспячэнне ўзнікла ў 2019-м, калі быў устаноўлены тарыф 3,35 капейкі за кВт·г. Аднак не ўсе, хто хацеў плаціць такую цану, валодалі інфармацыяй, хто мае на гэта права. Другая хваля жадаючых выкарыстоўваць электраэнергію ўзнялася пасля прыняцця Указа Прэзідэнта № 127, які датычыўся пакрыцця з мясцовага бюджэту часткі расходаў на электразабеспячэнне жылля, якое выканалі ўладальнікі дамоў. 40 % ад кошту выкананых работ па электразабеспячэнні жылля вернуць малазабяспечаным і іншым уразлівым катэгорыям грамадзян, аднак сума пры гэтым не можа быць большая за 80 базавых велічынь. Усе астатнія могуць разлічваць на пакрыццё да 20 % ад кошту выкананых работ па электразабеспячэнні, і сума не можа перавышаць 20 базавых велічынь.*

Электразабеспячэнне жылля адносіцца да работ па рэканструкцыі, таму павінна выконвацца адпаведна з заканадаўствам, падкрэсліў спецыяліст. Тыя, хто пачаў рабіць электраўстаноўкі, не дачакаўшыся пачатку дзеяння адпаведных дакументаў, права на пакрыццё часткі расходаў за выкананыя работы не маюць увогуле. Каб ведаць, з чаго пачынаць работы, варта пачытаць інфармацыю з раздзела «Актуальнае» на сайце «Белэнерга», альбо звярнуцца ў службу «адно акно» электрасетак ці напісаць запыт, параіў Андрэй Нягодзька.

### ПОПЫТ ВЯЛІКІ — РЭКАНСТРУКЦЫЯ АБМЕЖАВАНАЯ

Усе эксплуатуемыя размеркавальныя электрычныя сеткі краіны ў сельскай мясцовасці маюць абмежаванні па прапускной здольнасці, бо праектаваліся без уліку выкарыстання электраэнергіі на гатаванне ежы, гарачае водазабеспячэнне і ацяпленне.

*— У мінулыя дзесяцігоддзі пры праектаванні размеркавальных сетак у раёнах індывідуальнай забудовы з дамамі не павышанай камфортнасці дазволеная да выкарыстання магутнасць была 3,5-4 кВт, а ў жыллі павышанай камфортнасці — каля 11,5-12 кВт. Пры выкарыстанні электраэнергіі на ацяпленне, гатаванне ежы і гарачае водазабеспячэнне электранагрузка ўзрастае адпаведна да 10 і 25 кВт,* — заўважыў **Віктар РУДКОЎСКІ, начальнік упраўлення эксплуатацыі электрычных сетак «Белэнерга».** — *Цяпер пры звароце грамадзян па выдачу тэхнічных умоў (ТУ) на абсталяванне жылля сістэмай комплекснага выкарыстання электраэнергіі замяраецца рэзерв прапускной здольнасці электрасетак, і калі ён ёсць, чалавек можа яго атрымаць.*

Тым не менш зразумела, што пакуль сеткі не будуць рэканструяваны, энергазабяспечваючыя арганізацыі не могуць задаволіць заяўкі ўсіх грамадзян на падключэнне да электрасетак.

*— Сёлета ў энергазабяспечальныя арганізацыі паступіла больш за 13,4 тысячы заяў на выдачу тэхнічных умоў для выкарыстання электраэнергіі на пазначаныя мэты. Амаль 11 тысячам грамадзян (81 %) ТУ выдалі,* — акрэсліў Андрэй Нягодзька.

Скаргі на несвоечасовую рэканструкцыю электрасетак пры планавым узвядзенні Беларускай АЭС узнікаюць ад таго, што людзі не ўяўляюць сабе працягласць размеркавальных электрасетак і аб'ём грошай, неабходных для іх мадэрнізацыі. На пачатак 2021-га працягласць сетак напружаннем 0,4-10 кВ у краіне складала больш за 200 тысяч кіламетраў (пры жаданні Зямлю імі можна абгарнуць пяць разоў), а на рэканструкцыю кожнага кіламетра сеткі патрэбна каля 140 тысяч рублёў. Знайсці такія сродкі ў адзін момант не могуць ні энергазабяспечальныя арганізацыі, ні дзяржава ў цэлым, запэўніў спецыяліст.

Заявы ад грамадзян, якія жадаюць электрыфікаваць сваё жыллё, разглядаюцца згодна з чарговасцю іх паступлення, а тэхнічныя ўмовы на падключэнне электраўстановак сістэм ацяплення, гарачага водазабеспячэння і гатавання ежы — да моманту заканчэння рэзерву прапускной здольнасці электрасеткі. Усе адмовы ў выдачы ТУ ўлічваюцца для наступнай першачарговай рэканструкцыі сетак пасля таго, як яны будуць самартызаваны (у план рэканструкцыі ўключаюцца толькі самартызаваныя электрасеткі), патлумачыў Андрэй Нягодзька.

А вось у мястэчках, дзе падведзены газ або маюцца цэнтралізаваныя цеплакрыніцы з рэзервам прапускной здольнасці, рэканструкцыя электрасетак выконваецца без уліку выкарыстання электраэнергіі на пазначаныя мэты. Акрамя таго, распрацоўваецца праект аб будаўніцтве размеркавальных электрасетак, дзе плануецца замацаваць норму аб удзеле грамадзян у фінансаванні несамартызаваных электрасетак. Мяркуецца, што сума не будзе перавышаць 30 % ад агульнага кошту рэканструкцыі.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Сацыялогія

# «ЛЮДЗІ, ЯКІЯ ДУМАЮЦЬ, ГЭТА БАЧАЦЬ»

**Чарговымі высновамі аб выніках апытання грамадскай думкі, якое па заказе ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» з 5 да 21 ліпеня праводзіў Аналітычны цэнтр EcooM з прыцягненнем фонду «Украінская палітыка», дзеліцца дырэктар Аналітычнага цэнтра Сяргей МУСІЕНКА.**

**Гэтым разам у цэнтры ўвагі сацыёлагаў — погляд грамадзян на сваё матэрыяльнае становішча і на міжнароднае супрацоўніцтва Беларусі.**

***У прыватнасці, рэспандэнтам было зададзена пытанне: з якімі дзяржавамі (міжнароднымі арганізацыямі) Беларусі неабходна выбудоўваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва ў першую чаргу? У ліпеньскім апытанні прадстаўлены параўнальны аналіз з данымі, атрыманымі падчас лютаўскага апытання, праведзенага па заказе БелТА.***

«Мы хацелі параўнаць, як змянілася меркаванне людзей за мінулыя паўгода. На што б я звярнуў тут увагу, дык гэта на ролю Кітая. Яна вырасла практычна ў два разы — з 15,3 % у лютым да 27,6 % у ліпені. Што датычыцца ЕАЭС, то лічбы засталіся практычна такія ж — 13,2 % і 13,8 % адпаведна. Амаль нязменным і нізкім засталося жаданне супрацоўніцтва з ЗША — 5,7 % у лютым і 5,5 % у ліпені. А вось ЕС крыху прасеў з 17,6 % да 14,8 %. Пра што ўсё гэта кажа? Ролю Расіі мы ўсё выразна ўбачылі, а ролю Кітая мы хацелі б убачыць больш аб'ёмна ў святле ініцыятыў, — сказаў Сяргей Мусіенка. — Невялікае зніжэнне Расіі з 39,8 % да 31,1 % кажа пра тое, што ёсць узаемавыгаднае супрацоўніцтва, яно развіваецца, мы бачым яго плён і вынікі, і таму сітуацыя стала стабільнай, яна не патрабуе актыўнага пацвярджэння».

***Беларусам таксама прапаноўвалася ацаніць дзеянні краін і аб'яднанняў у адносінах да падзей у нашай краіне.***

«Гэта вельмі цікавае пытанне, асабліва ў параўнанні з папярэднімі данымі. І адразу прыкметны рост Расіі — з 16,8 % у лютым да 51 % у ліпені. І лютаўскае «хутчэй станоўча» перамяшчаецца ў ліпеньскае больш дакладнае «станоўча». Тут жа падзенне «адмоўна» і «хутчэй адмоўна». Мы ўбачылі выразную падтрымку Расіі. І зноў жа значны рост Кітая: «станоўча» — з 16,3 % да 28 %, «хутчэй станоўча» — з 29 % да 31,3 %.

На гэтым фоне прыкметнае падзенне ацэнак пазіцый Польшчы — «хутчэй адмоўна» і «адмоўна» — 65,1 % (у лютым — 42,4 %) і Украіны — 55,4 % (39,7 %). «У людзей пачалі спадаць ружовыя акуляры, яны проста нарэшце задумаліся. Але тое шмат у чым залежыць ад пазіцыі саміх гэтых краін: Польшчы, Украіны і іншых, імклівае падзенне ў ацэнках ролі якіх мы бачым. Тэндэнцыю вельмі добра відаць у параўнанні. Мы бачым двухразовае падзенне ў тых жа краін Балтыі, і гэта шмат пра што кажа. У параўнанні з лютым, вельмі выразна сябе праявілі ЗША. У лютым «станоўча» і «хутчэй станоўча» — каля 12 %. Цяпер — толькі 3 %. Краіны праз сваіх прадстаўнікоў даносяць да нас сваю пазіцыю. Людзі, якія думаюць, гэта бачаць, і адсюль такая адмоўная рэакцыя», — падкрэсліў Сяргей Мусіенка.

***Яшчэ адно пытанне, зададзенае беларусам: як змянілася ваша матэрыяльнае становішча за апошні год? «Істотна палепшылася» — так адказалі 2,9 % апытаных, «нязначна палепшылася» — 6,9 %, «не змянілася» — 41 %, «нязначна пагоршылася» — 28,3 %, «істотна пагоршылася» — 5,3 %.***

«Тут адказы паказальныя, таму што гэта год ковідных абмежаванняў ва ўсім свеце. Але мы жывём у сітуацыі, калі ў нас няма лакдаўнаў, карантыну, каменданцкай гадзіны, драконаўскіх мер, абмежаванняў. За паўгода ў 3 % насельніцтва адбылося паляпшэнне матэрыяльнага становішча і не змянілася сітуацыя ў 40 % апытаных. Так, ёсць нязначнае пагаршэнне, але яно было і ў лютым. Часта мы сутыкаемся з тым, што гэта нейкая ўстаноўка, сацыяльнае мысленне. Мне дрэнна. А ў чым дрэнна? Няма адказу», — дадаў Сяргей Мусіенка.

**Паводле БелТА.**

# ТРАГЕДЫЯ «ЗІМОВАГА ЧАРАЎНІЦТВА»

## За паўтара месяца карнай аперацыі было спалена больш чым 430 вёсак, знішчаны тысячы мірных жыхароў

**У лютым — сакавіку 1943 года на тэрыторыі Асвейскага, Дрысенскага і Расонскага раёнаў, што на Віцебшчыне, а таксама Себежскага раёна Расіі гітлераўцы лютавалі з нечалавечай жорсткасцю. Акупанты, а таксама іх памагатыя ўздоўж граніцы з Латвіяй планавалі стварыць 40-кіламетровую паласу «мёртвай зямлі» — спаліць усе вёскі, а іх жыхароў знішчыць. Адна з самых жорсткіх і крывавых карных аперацый нацыстаў мела прыгожую, паэтычную назву «Зімовае чараўніцтва»...**



Падчас аперацыі «Зімовае чараўніцтва» многія вёскі ператварыліся ў пустыні.

Доўгі час аб гэтым жудасным злачынстве фашыстаў на нашай зямлі мала хто ведаў. Фактычна, не цікавіліся ім і гісторыкі. Наша беларуская талерантнасць, дыпламатычнасць не дазвалялі псаваць адносіны з суседзямі: асноўнай ударнай сілай гэтай карнай аперацыі былі не нямецкія падраздзяленні, а латышскія паліцэйскія батальёны.

### Нямецкая разведка пралічылася

Да пачатку 1943 года гэтая тэрыторыя кантралявалася партызанамі — тут дзейнічала Расонска-Асвейская партызанская зона. Геаграфічнае становішча на памежжы Беларусі, Расіі і Латвіі прадвызначыла яго важнае стратэгічнае значэнне, яно служыла своеасаблівым плацдармам для разгортвання савецкага партызанскага руху ў гэтых рэспубліках.

**Тым часам**

Генеральны пракурор Беларусі Андрэй Швед звярнуўся да прэм'ер-міністра краіны Рамана Галоўчанкі з просьбай прапрацаваць пытанне аб арганізацыі ўвекавечання ахвяр генацыду мірных грамадзян і перапахавання астанкаў для захавання гістарычнай памяці аб зверствах нацысцкіх злачынцаў на тэрыторыі Беларусі.

Калі верыць агентурным даным Абвера, у пачатку 1943 года каля Асвеі дыслацыраваўся латышскі партызанскі атрад колькасцю каля 80 чалавек і беларускія партызанскія фарміраванні, у якіх налічвалася як мінімум 500 народных мсціўцаў. Насамрэч, нямецкая разведка недаацэньвала свайго праціўніка: савецкія дакументы сведчаць, што агульная колькасць савецкіх партызанаў у Расонска-Асвейскай партызанскай зоне перавышала восем тысяч чалавек.

«Наяўнасць вялікай колькасці партызанаў у Расонах азначае небяспеку, якая ўсё расце, — паведамлялася ў дакладзе начальніка айнзацгрупы «Б». — З гэтага вынікае стварэнне спрыяльнай абстаноўкі для правядзення аперацый Чырвонай Арміі ў тыле нямецкіх войскаў».

### Карнікі-латышы

Гітлераўцы бачылі ў партызанскіх фарміраваннях рэальную пагрозу, таму ішлі на ўсё, каб іх ліквідаваць. Першая такая спроба была здзейснена ў студзені 1943-га. Аперацыя пад кодавай назвай «Заяц-бяляк» скончылася для насельніцтва партызанскага краю страшнай трагедыяй. Менш чым за месяц на Расоншчыне было знішчана 260 жылых хат, расстраляна і зажыва спалена 1245 чалавек, у тым ліку 214 дзяцей. Партызанскія злучэнні, якія трапілі пад удар карнікаў, сур'ёзных страт не панеслі.

Працягам аперацыі «Заяц-бяляк», па задуме фашыстаў, павінна была стаць аперацыя «Зімовае чараўніцтва». Яе ўзначальваў вышэйшы кіраўнік СС і паліцыі «Остланд» і «Расія — Поўнач» Фрыдрых Ёкельн. Менавіта па яго рашэнні аснову карнай групоўкі склалі восем латышскіх паліцэйскіх батальёнаў. Нямецкія падраздзяленні і ўкраінскі паліцэйскі батальён не былі ўключаны ў склад баявых груп, а з'яўляліся своеасаблівым рэзервам камандавання.

«Бандыты і падазроныя прынцыпова падлягаюць расстрэлу. Усе астатнія асобы, калі яны прыдатныя да працы, уключаючы дзяцей, могуць быць пакінуты па ўсебаковым узгадненні СД і вайсковых часцей», — адзначалася ў загадзе Ёкельна. Акрамя таго, каманды паліцыі бяспекі і СД павінны былі знішчаць і населеныя пункты — падобныя загады маглі аддаваць нават афіцэры ўзроўню камандзіра роты.

Выканаўцам гэтых акцый бесчалавечнасці быў у тым ліку штурмбанфюрэр Рудольф Ланге — адзін з галоўных арганізатараў Халакосту ў Латвіі. У склад яго групы ўваходзіла і частка «каманды Арайса», найбольш вядомага латышскага падраздзялення, на рахунку якога — масавыя забойствы яўрэяў у Латвіі і Беларусі. Монаэтнічны састаў карнікаў быў «разбаўлены» эстонцамі, літоўцамі і ўкраінцамі. Агульная колькасць тых, хто быў задзейнічаны ў аперацыі «Зімовае чараўніцтва», не ўказваецца ні ў адным нямецкім дакуменце. Па падліках беларускіх гісторыкаў, гэта каля 5—5,5 тысячы чалавек. Амаль чатыры тысячы з іх складалі латышскія паліцэйскія фарміраванні.

### Бесчалавечнымі метадамі

Забойствы мірных жыхароў пачаліся ў першы ж дзень нацысцкай карнай аперацыі. У адным з паведамленняў у Цэнтральны штаб партызанскага руху гаварылася аб прымяненні карнікамі «нечуваных зверстваў да насельніцтва». Вось як самі гітлераўцы апісалі тыя падзеі: «Уваходзячы ў сяло (спачатку не было ніякага супраціўлення), адразу ж расстрэльвалі падазроных у партызанскай дзейнасці. Такімі лічыліся амаль усе мужчыны ва ўзросце ад 16 да 50 гадоў... Першае (за вайсковымі часцямі) ішло СД, якое дзейнічала прыблізна так: расстрэльвала ўсіх астатніх падазроных. Старых і нямоглых, якія адставалі ў дарозе, расстрэльвалі. Астатнім, у большасці сваёй жанчынам і дзецям, належыла прайсці так званую другую фільтрацыю. Тых, хто не ў стане быў працягваць ісці, расстрэльвалі... Вёскі рабавалі і спальвалі яшчэ да прыбыцця гаспадарчых камандаў, якія займаліся дастаўкай каштоўнасцяў у бяспечнае месца».

Аб тым, што апісаны генеральным камісарам Латвіі Дрэхслерам алгарытм дзеянняў карнікаў адпавядаў рэчаіснасці, сведчыць трагічны лёс захопленага ў першы ж дзень аперацыі сяла Росіца, а таксама навакольных вёсак. Памылка нямецкай разведкі каштавала мірным жыхарам жыццяў: з-за лжывай інфармацыі пра тое, што Росіца з'яўляецца апорным пунктам партызан, група СД знішчыла 206 сялян. Акрамя таго, на працягу некалькіх дзён сюды яшчэ прыганялі жыхароў навакольных вёсак: адных адбіралі для вывазу ў канцлагер Саласпілса, іншых разам з двума святарамі зажыва спалілі ў мясцовым касцёле. Па некаторых звестках, усяго ў Росіцы было знішчана больш за 1200 чалавек.



Мірныя жыхары, выгнаныя са сваіх хат карнікамі. Віцебшчына, 1943 г.

Сярод катаў бязвінных людзей былі і латышскія вайскоўцы. Тое, што яны бралі непасрэдны ўдзел у забойстве мірных жыхароў, пацвярджае вытрымка аднаго з данясенняў камандавання латышскіх паліцэйскіх батальёнаў: «У выпадках, калі з-за адсутнасці ў непасрэднай блізкасці СД расстрэлы неабходна праводзіць пры дапамозе войскаў, экзекуцыі павінны адбывацца ў хатах. Трупы варта пакрываць саломай або сенам і там жа спальваць».

Фашысты ўчынілі жахлівую расправу з сям'ёй Юхневічаў з вёскі Бяляны. Васьмігадоваму Віктару на грудзях і на спіне гітлераўцы выразалі пяціканцовыя зоркі, потым кінулі хлопчыка ў вогнішча. Веру, якой было сем гадоў, зарэзалі нажом, паўтарагадоваму Яўгену разбілі галаву, вырвалі пальцы і таксама кінулі ў полымя. У маці дзяцей выразалі грудзі і таксама спалілі. Зажыва згарэла і сям'я Шкутавых (сем чалавек!) з вёскі Барысава. У вёсцы Кісялі цалкам знішчылі сям'ю Максуль. А Жоравых з Гарадзілавіч утапілі ў рацэ Свольна, перад гэтым выразаўшы на іх целах пяціканцовыя зоркі. Былі выпадкі, калі гітлераўцы насаджвалі на калы платоў малых дзяцей. Бесчалавечна яны абыходзіліся і з маладымі дзяўчатамі. Дакументы сведчаць — большасць загінулых перад смерцю зведала страшныя катаванні і здзекі.

### «Дайце боепрыпасаў!»

Партызаны аказвалі гітлераўцам супраціўленне. Першыя ў бой уступілі дзве беларускія (Асвейская імя Фрунзэ і Дрысенская) і 11-я калінінская партызанская брыгады. Па сваёй колькасці яны саступалі карнікам, таму пад ударамі праціўніка партызаны вымушаны былі адступаць. У канцы лютага 1943 года да барацьбы падключыліся Сіроцінская і 4-я калінінская партызанскія брыгады. Аднак сітуацыя не палепшылася. Асноўнымі прычынамі няўдач партызанскіх фарміраванняў з'яўляліся адсутнасць каардынацыі ў іх дзеяннях, а таксама недахоп боепрыпасаў — нялётнае надвор'е не дазваляла даставіць іх з савецкага тылу.

«Канец нашых запасаў боепрыпасаў, і толькі гэта, прымушае нас часта аслабляць наш дакладны знішчальны агонь, і мы вымушаныя паступова з баямі адыходзіць на новыя абарончыя рубяжы, — паведамлялася ў данясенні ўрача Асвейскай партызанскай брыгады імя Фрунзэ А. Вараб'ёва сакратарам Віцебскага падпольнага абкама КП(б)Б. — Сёння нашы атрады, упэўненыя ў разгроме фашысцкіх сцярвятнікаў і іх знішчэнні, без боепрыпасаў займаюць абарону на заходнім узлессі... Ззаду нас — лес, перапоўнены сем'ямі мірных жыхароў, бежанцаў, якія беглі ад жудаснай расправы гітлераўскай поскудзі. Дайце нам боепрыпасаў! Патроны... патроны!»

Неўзабаве для барацьбы з ворагам былі створаны дзве партызанскія групоўкі. Аб'яднанне сіл дазволіла стрымаць праціўніка, затармазіла яго прасоўванне. Быў разгромлены нямецкі гарнізон у вёсцы Гаі. Аднак спроба зайсці ў тыл да карнікаў, а таксама штурм вёскі Каханавічы скончыліся няўдачай — адбіўшы атакі партызанаў, праціўнік працягваў наступаць. Нягледзячы на тое што баявыя дзеянні скончыліся, гітлераўцы па-ранейшаму бесчалавечна абыходзіліся з мірнымі жыхарамі: экіпажы самалётаў, якія па начах дастаўлялі для партызанаў боепрыпасы, назіралі вакол Асвеі вогнішчы — гарэлі вёскі.

Тыя, хто здолеў пазбегнуць фашысцкай расправы, беглі ў лес да партызанаў. Бежанцаў было так шмат, што многім з іх не маглі даць не тое што прытулку, часта немагчыма было ўсіх нават накарміць. Ускладнялася сітуацыя ўспышкамі тыфу — людзі паміралі.

### Замест вёсак — пустыні

Аб'яднанне партызанскіх сіл і каардынацыя іх дзеянняў прывялі да таго, што гітлераўцы пачалі пакідаць занятыя раёны. Але нават сыходзячы, карнікі працягвалі рабіць сваю чорную справу: знішчалі на сваім шляху ўсе населеныя пункты, на прымусовыя работы вывозілі людзей. 30 сакавіка Ёкельн выдаў загад аб завяршэнні аперацыі. Аднак у ім не было ні слова аб тым, што карнікі не змаглі ў поўнай меры выканаць пастаўленыя задачы. Яны не разлічвалі на такое супраціўленне партызанаў, таму замест запланаванай 40-кіламетровай «мёртвай зоны» ім удалося стварыць толькі 15-кіламетровую.

Аднак хапіла і гэтага. Асвейскі раён быў цалкам знішчаны, моцна пацярпеў Дрысенскі — на тэрыторыі двух раёнаў пасля аперацыі «Зімовае чараўніцтва» не далічыліся 376 населеных пунктаў. На Расоншчыне былі спалены 11 вёсак. У расійскім Себежскім раёне карнікі знішчылі 52 населеныя пункты. Тэрыторыі двух сельскіх Саветаў увогуле ператварыліся ў пустыні.

Згодна з данясеннем камандуючага вермахта ў рэйхскамісарыяце «Остланд» генерала Брэмера, падчас аперацыі «Зімовае чараўніцтва» былі забітыя 3904 мірныя жыхары і 221 партызан, 7275 чалавек адправілі на прымусовыя работы ў Германію. Па інфармацыі ж Цэнтральнага штаба партызанскага руху, колькасць забітых народных мсціўцаў была істотна меншая — 70—80 чалавек. У пазнейшым паведамленні гаворыцца аб 137 забітых у баі партызанах, 1807 расстраляных «памагатых» і больш за 2000 чалавек, сагнаных у лагер «Саласпілс». Такое разыходжанне ў лічбах сведчыць аб тым, што дакладны ўлік пацярпелых не вёўся. Аднак зразумела адно — ахвяр было шмат.

Найбольш дакладна падлічыць страты дапамаглі мясцовыя жыхары, якім пашчасціла пазбегнуць расправы гітлераўцаў. Дзякуючы дакументам, што датычацца аперацыі «Зімовае чараўніцтва», супрацоўнікам Нацыянальнага архіва Беларусі ўдалося скласці максімальна поўны спіс знішчаных населеных пунктаў на тэрыторыі Расонскага, Асвейскага, Дрысенскага і Себежскага раёнаў. Калі верыць гэтаму спісу, падчас аперацыі было знішчана 439 населеных пунктаў, забіта 13 677 мірных жыхароў. Як бачым, гэтыя даныя значна адрозніваюцца ад звестак нямецкага генерала.

**Вераніка КАНЮТА,**
**Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ,**
**кандыдат гістарычных навук.**

## У лабірынтах мастацтва

# МАСТАК, СЫН МАСТАКА, ЗАХАВАЛЬНІК ЧАСУ


У Заслаўі.

**СЁЛЕТА спаўняецца 140 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Пятровіча Станюты, вядомага беларускага мастака XX стагоддзя. Зрэшты, як аказалася, вядомы ён толькі дзвюма-трыма сваімі карцінамі, а для юбілейнай выстаўкі была неабходная значна большая іх колькасць. Так на хвалі юбілею лёс звёў мяне з сям'ёй Станютаў — нашчадкаў Міхаіла Пятровіча.**

У патрыярха беларускага жывапісу было двое дзяцей. Стэфанію Міхайлаўну Станюту ведаюць як народную артыстку. Дом на праспекце Незалежнасці, 29, дзе яна жыла ў 1951—1960 гадах, адзначаны мемарыяльнай дошкай у яе гонар аўтарства Генадзя Мурамцава.

Але мала хто ведае, што ў гэтым жа доме жыў у адной кватэры з актрысай і яе бацька-мастак Міхаіл Пятровіч Станюта... Яго сын Уладзімір Міхайлавіч, якому сёння 83 гады, жыве тут ужо больш за 70 гадоў. Ён аказаўся цікавым чалавекам і суразмоўнікам, уладальнікам велізарнага сямейнага архіва і ўчэпістай памяці.

У гэтай кватэры нібы застыў час: за доўгія гады ў ёй амаль нічога не змянілася. Усё як пры бацьку. Стары кватэры — знаходка для мастацтвазнаўцаў, там гадамі назапашваецца «культурны пласт» фотаздымкаў, альбомаў, лістоў, кніг, карцін, малюнкаў. У гэтых запасах знайшліся сапраўдныя багацці — стары фотаздымак 1907 года рахункавода Лібава-Роменскай чыгункі Міхаіла Пятровіча Станюты, сотні малюнкаў 1950—1960-х гадоў, карціны майстра, альбомы Віталя Цвіркі з дарчымі надпісамі Міхаілу Станюце — дарагому настаўніку ад удзячнага вучня. Адзіная, бадай, у беларускім мастацтве 1930-х ацалелая вялікая карціна «ню» — партрэт жонкі. Вось толькі сямейных фатаграфій Уладзіміра з бацькам і сястрой амаль няма. «Бацька ўсё больш нас маляваў, фатаграфавалі толькі знаёмыя, а ў фотаатэлье мы чамусьці не хадзілі...»


Дом мастацтваў, 1989 год.

Уладзімір — сын ад другога шлюбу. Удавец Міхаіл Станюта ў 1934 годзе ажаніўся другі раз з Клаўдзіяй Мазалёўай, маладой дзяўчынай, равесніцай сваёй дачкі. Меў сына і ўнука аднаго ўзросту. Нягледзячы на розніцу ва ўзросце, пражылі з жонкай душа ў душу амаль 40 гадоў. Розніца паміж яго дзецьмі — Стэфаніяй і Уладзімірам — 24 гады, але нягледзячы на гэта, яны былі вельмі дружныя. Уладзімір называў зводную сястру «на Вы» і па бацьку. Стэфанія Міхайлаўна лагодна ставілася да малодшага брата, падтрымлівала яго ўсё жыццё. Уладзімір у дзяцінстве дарыў сястры сваіх пластылінавых конікаў, якіх сам жа і размалёўваў. «Адбіліся гены дзеда па маці, які быў ганчар, ляпіў і прадаваў свістулькі». Старэйшая сястра беражліва ставіла іх на трумо, паказвала гасцям і доўга захоўвала...

Сын мастака паказаў шмат невядомых карцін і малюнкаў бацькі, але яшчэ большым адкрыццём было тое, што Уладзімір Міхайлавіч сам аказаўся мастаком, і вельмі цікавым і рознабаковым! І не самавукам-аматарам — з мастацтвам ён быў звязаны работай мастака-афарміцеля. Працаваў у кінатэатры «Перамога», Галоўпаштамце, магазіне «Акіян». Прафесія гэтая сышла ў нябыт са з'яўленнем лічбавага друку ў пачатку 2000-х, але шмат хто з мінчан яшчэ памятае маляваныя афішы на фасадах кінатэатраў.

У яго сотні акварэляў, выкананых у 1960—1970-я гады. Адзіная яго выстаўка разам з каранпластыкай Стэфаніі Станюты, пра якую згадваюць усе, хто з ёй працаваў, прайшла ў Доме мастацтваў на праспекце Леніна ў 1987 годзе. Так Стэфанія Міхайлаўна адзначыла 50-годдзе брата.

Калі па маёй просьбе ён прынёс свае творы (у верасні рыхтуецца экспазіцыя на радзіме яго бацькі, у раённым краязнаўчым музеі ў Чэрвені), я была здзіўленая яго адчувальнасцю і густам у складанай тэхніцы акварэлі. «У дзяцінстве пайшлі з прыяцелем запісвацца ў студыю Сяргея Каткова. Каткоў зрабіў заўвагу прыяцелю, той агрызнуўся, пакрыўдзіўся і сышоў. І я ўслед за ім — тады лічыў, што па-таварыску паступіў, не кінуў сябра. Да гэтага часу шкадую, што ўпусціў тую магчымасць», — распавядае Уладзімір Станюта.

Любімы жанр Уладзіміра Станюты — пейзажы, напісаныя акварэллю недалёка ад Мінска, у Ждановічах, на Мінскім моры, у Ратамцы, Заслаўі. Як яго бацька ў старасці штодня прыходзіў у Парк Чалюскінцаў — для натурных замалёвак і зносін, так і яго сыну неабходныя былі гэтыя спатканні з прыродай — але, наадварот, у поўнай адзіноце. За некалькі гадзін з'яўляліся лірычныя, паэтычныя творы. Іх некалькі сотняў. Гэта класічныя акварэлі, створаныя ў тэхніцы «па мокрым». Вельмі вытанчаныя кветкавыя нацюрморты, напісаныя тонка, абагульнена.

Міхаіл Пятровіч памёр у 93 гады ў 1974 годзе, 2 студзеня, у дзень 35-годдзя сына. За ўсё жыццё ў яго была адзіная персанальная выстаўка да 90-годдзя. Смерць яго — глыбокага пенсіянера, вельмі старога чалавека — засталася амаль незаўважанай. Некралога ў газетах у святочныя навагоднія дні не было, галоўнай навіной тады стала выправаджэнне з СССР Аляксандра Салжаніцына. На пахаванні прысутнічалі родныя, старая мінская інтэлігенцыя — дырэктар музея Алена Аладава, акцёры Купалаўскага тэатра, якія прыйшлі падтрымаць Стэфанію Міхайлаўну, Ларыса Александроўская, Андрэй Бембель... 100-годдзе з дня нараджэння Міхаіла Станюты ў 1981 годзе адзначылі вельмі сціпла: невялікай выстаўкай графікі ў Палацы мастацтваў.

Каб неяк пераадолець забыццё, Уладзімір у 1990-я гады задумаў устанавіць бацьку дастойны помнік. З плітой дапамагла Стэфанія Міхайлаўна, ён сам вылепіў партрэтны барэльеф бацькі, адліты ў бронзе. Ляпіў упершыню ў жыцці, але ўспомніў, што ён нашчадак дзеда-ганчара, і вырашыў, што пачуццё пластыкі павінна ж перадавацца ў спадчыну. «Я расслабляўся і зрабіў». Вылепіў каля падножжа пліты алегарычныя фігуры па матывах класічных надмагілляў XIX стагоддзя. Іх адлілі з бетону майстры на мастацкім камбінаце. Думаю, што такі незвычайны помнік Мастаку — адзіны на Чыжоўскіх могілках.

**Надзея УСАВА,**
**вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі.**

# «Не «іграць» трэба, а пражываць кавалачак чужога жыцця, як уласнага»



**Вядомы беларускі акцёр, дэкан тэатральнага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, прафесар Уладзімір МІШЧАНЧУК адзначае сваё 75-годдзе. «Звязда» задала юбіляру некалькі пытанняў.**

***— Уладзімір Андрэевіч, ужо не адно дзесяцігоддзе вы плённа працуеце на тэатральнай ніве... Вы былі самым маладым дырэктарам тэатра і адначасова артыстам у былым СССР і першым акцёрам-дырэктарам у Беларусі... Вы некалькі дзесяцігоддзяў з'яўляецеся дэканам тэатральнага факультэта Акадэміі мастацтваў, вы вядучы майстар сцэны Тэатра-студыі кінаакцёра... Здымаецеся ў кіно, на тэлебачанні, ваш голас гучыць на радыё, вы малюеце, пішаце вершы... Сям'я, унукі, праўнукі... Як вас на ўсё хапае?***

— Дзякуй вам, рэдакцыі «Звязды», за ўвагу да маёй персоны! Вы практычна пра мяне ў сваім пытанні ўсё распавялі. Гэта чыстая праўда... Тут можна сказаць вершаваным радком: «Гады ідуць і лік свой маюць, вядучь разлік і пэўных дат...» Я перакананы ў тым, што кожны чалавек — гаспадар свайго лёсу, якія б катаклізмы, стрэсы, неспадзяванкі яму ні выпала перажываць, чалавек павінен сябе помніць і заставацца чалавекам...

Я ўдзячны Богу, сваім бацькам, настаўнікам у вясковай школе на Палессі, настаўнікам у колішнім Беларускім дзяржаўным тэатральным інстытуце, дзе лёс звязаў мяне з маёй аднакурсніцай — у будучыні жонкай, маці маіх дзяцей... З якой мы ідзём па жыццёвых лабірынтах вось ужо пяцьдзясят два гады! Усё перажываем разам: радасці і гора, пахвалы і абразы, поспехі і няўдачы, крыўды і прызнанне. Дарэчы, мы з маёй Людмілай Пятроўнай нарадзіліся амаль у адзін дзень. Яна трэцяга, а я пятага жніўня. Стараемся выпрацоўваць жыццёвы імунітэт, не толькі да ковіду, але і да ўсяго негатыўнага ў нашым асяроддзі.

***— А як бы дэкан творчага факультэта апісаў сёння студэнцкую моладзь?***

— Яны дзеці свайго часу! З яго сучаснымі тэхналогіямі, тэхнічнымі неверагоднымі дасягненнямі. У іх айфонах і тэлефонах на далоні ўвесь сусвет. Інфармацыя на любы густ. На вялікі жаль, большасць з будучых студэнтаў Акадэміі мала чытае кніг, нашых класікаў, недастаткова цікавіцца гісторыяй сваёй Радзімы. Успрыманне жыцця і дыялогі паміж сабой — «кліпавыя», «эсэмэсныя». А для будучага творцы, артыста, рэжысёра гэтага мала. Вось тут і палягае праблема: як іх вярнуць да аналітычнага, чалавечага мыслення? Да таго каб ён ці яна маглі на сцэне ці ў кіно не «іграць», а пражываць кавалачак чужога жыцця, як уласнага.

***— Уладзімір Андрэевіч, скажыце, калі ласка, як Акадэмія забяспечвае кадрамі нашы дзяржаўныя тэатры? Якія міжнародныя сувязі з тэатральнымі школамі?***

— У нашай краіне на сённяшні дзень дванццаць тры прафесійныя тэатры. Конкурсы абітурыентаў, асабліва на акцёрскую спецыялізацыю, заўсёды ў нас вялікія, на рэжысёрскую — крыху меншыя. Мы практычна забяспечваем кадрамі ўсе нашы тэатры і іншыя творчыя ўстановы. Дзякуючы нашым клопатам, пры добрай падтрымцы Міністэрства культуры, праблем з працаўладкаваннем выпускнікоў у нас няма. На вялікі жаль, нашы выпускнікі не вельмі хочуць, умоўна кажучы, ехаць працаваць «на перыферыю». Ужо многа гадоў таму мы адкрылі завочную форму навучання па спецыялізацыі «Акцёрскае мастацтва» і «Рэжысура», куды набіраем выпускнікоў каледжаў мастацтваў.



Што датычыцца міжнародных сувязяў: яны ў нас да пандэміі былі выдатныя. Цяпер толькі анлайн. Мы сябруем з расійскімі вышэйшымі тэатральнымі акадэміямі.

***— Уладзімір Андрэевіч, вы былі ў ліку першапраходцаў і пры наборы кінематаграфічнай школы Беларусі.***

— Так. Было і такое ў маёй біяграфіі... Разам з Віктарам Туравым, Ігарам Волчакам, Віктарам Дашуком былі каля вытокаў беларускай кінематаграфічнай школы. І я ганаруся гэтым! З тэатральнага факультэта ўсё пачыналася: тады набралі першыя курсы рэжысёраў мастацкага, дакументальнага кіно, а таксама кінааператараў. Сёння ўжо адзінаццаць гадоў, дзякуючы прапанове і рашэнню нашага Прэзідэнта, існуе і плённа працуе факультэт экранных мастацтваў, самы малады ў нашай Акадэміі.

***— Запытаюся наконт вашых творчых планаў...***

— Для гэтага аднаго інтэрв'ю не хопіць. Удзячны Богу, лёсу, што я запатрабаваны і ў тэатры, і ў кіно, на тэлебачанні і радыё, дзе пражыў больш за сто роляў рознага кшталту.

Я ганаруся тым, што самастойна дабіваўся ўсяго, што я маю. Былі хібы, былі перамогі. Як у кожнага чалавека. Але ніколі мяне не пакідалі вера, надзея і любоў, як бы банальна гэта не гучала. Я не хадзіў па кабінетах кіраўнікоў, не люблю хадзіць і цяпер: выпрошваць, жаліцца, патрабаваць.

Я ведаю яшчэ, што шчасце чалавека не ў тым, чаго ў яго няма, а ў тым, што ён ёсць! Мой бацька прайшоў ліхалецце вайны, а потым працаваў у калгасе конюхам. Ён вучыў нас з братам Міколам ездзіць на коні. І вось аднойчы сказаў: «Хлопцы мае! Я хацеў бы, каб вы па гэтым жыцці ехалі на трох конях. Першы конь — дабрыня, другі — сумленне, трэці — сорам. І, крый божа, калі хоць адзін сыдзе з дарогі. Імкніцеся, каб яны заўсёды былі ў адной звязцы!» Вось гэтага пастулата я прытрымліваюся ўсё сваё жыццё і гэтаму вучу сваіх дзяцей, унукаў і праўнукаў.

**Гутарыла Арына КАРПОВІЧ.**

# «КАЛІ ГЛЯДАЧ НЕ РАЗВАЖАЕ, ДЛЯ МЯНЕ ГЭТЫ СПЕКТАКЛЬ ПРАПАШЧЫ»

## Гутарка з рэжысёрам Даніілам Філіповічам, які паставіў у Купалаўскім «Жаніцьбу»

**На мінулым тыдні ў Купалаўскім тэатры адбылася прэм'ера «Жаніцьбы» Мікалая Гогаля. Спектакль паставіў 27-гадовы Данііл Філіповіч. Рэжысёр атрымаў адукацыю ў Мінскім дзяржаўным каледжы мастацтваў, а потым трапіў на рэжысёрскі факультэт Расійскай акадэміі тэатральнага мастацтва. Данііл супрацоўнічаў з беларускімі тэатрамі: ТЮГам, Палескім, а таксама Гомельскім маладзёжным тэатрам. Мы паразмаўлялі з рэжысёрам аб прэм'еры «Жаніцьбы», творчых планах і адносінах з іншымі рэжысёрамі. Што з гэтага атрымалася, чытайце ў нашым інтэрв'ю.**



***— У анонсе да «Жаніцьбы» пазначана: «Рэжысёр у чарговы раз спрабуе ў класічным тэксце выявіць новыя сучасныя сэнсы і гучанні,ператвараючы простую гісторыю ў драматычны сюжэт». Ці атрымалася?***

— Выявіць новыя сэнсы заўсёды атрымліваецца, калі гэта класічны тэкст, таму што ён насычаны вобразнымі паняццямі. Гэта не сучасная літаратура, у якой менш вобразаў. У «Жаніцьбе» Гогаля ўсе прывыклі бачыць скваплівасць ды матэрыялізм. Але я меў на ўвазе зусім іншае. Мая тэма: жанчына жадала выйсці замуж і быць шчаслівай. З-за таго, што ў яе няма ніякага вопыту, яна памылілася і ў выніку засталася адна. Гэта трагедыя жанчыны, яе цела і душы. Нашы праблемы, акрамя нас саміх, ніхто не вырашыць. А тое, што нам кажуць: «У каго грошай больш, з тым і ажэнімся», — для мяне гэтая тэма зусім не актуальная і не цікавая.

***— Як гледачы адрэагавалі на новае прачытанне класічнага твора?***

— У гэты раз я, напэўна, упершыню паглядзеў свой спектакль з залы як глядач. Я не хацеў «выпендрыцца»: не маю на мэце здзівіць гледача. Глядач быў уражаны, але я гэтаму не веру. У мяне ёсць крытыкі: мае блізкія сябры, сваякі ды першы мастацкі кіраўнік. Вось ім я давяраю.

Мяне цікавіць сам працэс: рэпетыцыі, выяўленне маіх недахопаў, іх асэнсаванне. Па тых водгуках, што я чуў, у гледачоў склалася дваістае ўражанне. Камусьці зусім не спадабалася, камусьці спадабалася цалкам. Так адбываецца з кожнай маёй пастаноўкай. Я люблю, калі глядач сыходзіць, таму што яго нешта абурыла. Калі мы ўсе будзем абапірацца на густы гледача, мы больш не будзем існаваць як тэатр. Гэта памылковы ход — думаць, як адрэагуе хтосьці ў зале.

***— Вам падабаецца, калі гледачу няёмка?***

— Я люблю прымушаць гледача думаць. Калі ён не разважае, для мяне гэты спектакль прапашчы. У тэатра няма функцыі павучаць або выхоўваць. Ёсць функцыя ўразіць, натхніць, змясціць чалавека ў тую атмасферу, у якой ён раней ніколі не быў. Па такім прынцыпе і працуе імерсіўны тэатр (тэатр пагружэння. — **«Зв.»**). У мяне быў вопыт пастаноўкі «П'яных» Вырыпаева. Напэўна, тады мы і наблізіліся да таго, пра што цяпер з вамі гаворым. Спектакль ішоў у прасторы завода «Гарызонт», і ўзровень творчай свабоды быў даволі высокі. Мы дасягнулі яднання з гледачом. Людзі не маглі выйсці са спектакля, нават калі ім не падабалася. Яны былі пастаўленыя ў вельмі нязручнае становішча.

Ёсць рэжысёры, якія кажуць: «Мы не робім сучасны тэатр». Як вы не робіце сучасны тэатр, калі вы ставіце спектаклі ў 2021 годзе? Тое, што вы захоўваеце канон, створаны ў XVIII—XIX стагоддзях, зусім не кажа аб тым, што гэта класічны спектакль. Мы іншыя. Гэта не значыць, што мы дрэнныя. Проста мы жадаем свежасці і новай мовы. Які сэнс заставацца ў тых стагоддзях?

***— Што ўвогуле адбываецца з сучасным тэатральным працэсам у Беларусі?***

— У Беларусі няма з кім спаборнічаць. Самае жудаснае, што можна сказаць аб пастаноўцы, — «добры спектакль». А мы ў гэтым заселі. Усе мяркуюць, што я тут сеў і спачываю на лаўрах. Ніколі такога не было. Мы спаборнічаем толькі на словах у «Фэйсбуку» — гэта выглядае так смешна. Вы мастацтвам пазмагайцеся: са мной, з іншымі. Так, ёсць Нацыянальная прэмія. Але гэта не тая барацьба. Я бачыў спіс спектакляў-намінантаў... Чарговая падстава для жартаў. Тут кожны пяты можа сказаць: я рэжысёр...А ці назвалі б тыя, хто складае намінацыю, трох рэжысёраў Гомеля, Пінска, Маладзечна? А прозвішчы чатырох акцёраў з любога абласнога тэатра? У абласных тэатрах працуюць нашмат больш прафесійныя людзі, чым у Мінску.

Чаму, калі ў Маскве ты запытаешся, хто такая Фрэйндліх, табе адкажа амаль кожны. А тут падыдзеш і запытаеш: «Хто такая Зубкова?» І пачуеш: «Э-э-э». Сорамна не ведаць, што адбываецца ў тэатрах, сорамна не ведаць прозвішчаў рэжысёраў...




Я люблю Юру Дзівакова. Мы нават хацелі рабіць сумесны праект: адзін акт ставіць ён, другі — я. Але не знайшлі агульнай мовы з тэатрам. З Дзіваковым мы не пазмагаемся, таму што сябруем, аднак ён дастойны сапернік. Ён геній у беларускім тэатральным асяроддзі, не задумваецца, што скажуць крытыкі.

***— Вы ставілі Вырыпаева. Ці хацелі б паставіць нешта з сучаснай беларускай драмы?***

— З задавальненнем. Але аўтар павінен прыйсці да цябе. У 23 гады я пачаў працаваць з непрафесійным калектывам, які я набіраў сам. Мы рабілі сур'ёзныя спектаклі. Нас наогул не ўспрымалі. А ў нас поўныя залы. І неяк павялося, што я для ўсіх самотнік. Я, напэўна, не ўмею сябраваць з творчымі людзьмі.

***— Вы казалі, што вам не хапае свабоды эксперыменту. Няўжо не існуе ніякіх сродкаў, каб выправіць становішча?***

— За сваю кар'еру я зрабіў каля трыццаці пяці спектакляў. Мне ўжо проста нецікава працаваць з рускімі і беларускімі артыстамі, са знаёмымі мовамі. Я жадаю паспрабаваць новае. Што такое нямецкі акцёр? А англійскі? Гэта новая планка.

***— А што будзе, калі, скажам, на нямецкай сцэне паставіць беларускую класіку?***

—- Уяўляеце, «Паўлінка» на нямецкай у сучаснай інтэрпрэтацыі? Мы ведаем, што Паўлінка — сціплая дзяўчына, якая потым робіцца героем. Гэта ўсё можна лёгка перафразаваць на абсалютна іншае грамадства. Зрабіць усё сучасным, жывой мовай. Гэта называецца наватарства. Я з радасцю паглядзеў бы такую «Паўлінку».

***— Ці плануеце далей працаваць у Купалаўскім?***

— Я планую, але пакуль гэта застанецца ў сакрэце. Я не адзіны, хто тут будзе ставіць. Ёсць іншыя рэжысёры і іншыя пастаноўкі. Хутка даведаецеся гэтыя прозвішчы.

Я не люблю рэпертуарны тэатр. Мне падабаецца так: прыехаў, паставіў і з'ехаў. А потым праз паўтара года вярнуцца і паставіць што-небудзь новае.

Мне здаецца, што рэпертуарны тэатр хутка знікне. У Маскве гэта ўжо зрабілі: спектакль ідзе не больш за год, потым ставіцца наступны. Напрыклад, «Гогальцэнтр» — гэта структура, якая пастаянна абнаўляецца. Мабыць, у краіне будзе адзін нацыянальны рэпертуарны тэатр. У Маскве, напрыклад, Вахтангаўскі, у нас — Купалаўскі.

У Беларусі вельмі шмат таленавітых людзей, але сёння адчуваецца нейкая цішыня. Мабыць, цяпер такі час, і ўсім сапраўды трэба пабыць у цішыні.

**Арына КАРПОВІЧ.**

---

Запрашальнік

# Незгасальнае імкненне да гармоніі

**Калі на выдатныя тэатральныя пастаноўкі за мяжу немагчыма з'ездзіць, то на іх можна сходзіць у Мінску. Аматары праекта TheatreHD ужо даўно ацанілі яго выгоды, асабліва ў «мёртвы сезон». Як і тыя, хто любіць музычны тэатр, аматары драматычных спектакляў будуць усцешаныя ў жніўні. І не толькі яны...**

Пакажуць драмы і акрамя тых, што мы згадвалі раней, — «Доктара Фаўста» ў шэкспіраўскім «Глобусе» і «Франкенштэйна» ў пастаноўцы Дэні Бойла з Бенедзіктам Камербэтчам ды Джоні Лі Мілерам. Але ўсё ж не забыцца б 18 жніўня завітаць у «Falcon Club Буцік Кіно»: «Франкенштэйн: Лі Мілер». Гэтым разам ёсць магчымасць ацаніць работу другога выдатнага акцёра, які выступіў у ролі штучна створанай істоты. Праўда, усё больш цікава, таму што насамрэч два брытанскія акцёры мяняюцца ролямі, нездарма яны падзялілі дзве галоўныя лонданскія тэатральныя ўзнагароды — прэмію Лоўрэнса Аліўе і прэмію газеты Evening Standard...

Сустрэчы з брытанскімі акцёрамі працягне паказ камернага спектакля «Верхняе святло» ў кінатэатры «Цэнтральны» 10 жніўня. Кэры Маліган і Біл Наі ўвасобілі людзей, некалі вельмі блізкіх, але жыццё развяло іх па розныя бакі: хтосьці здолеў здабыць поспех, а хтосьці звычайны служачы без асаблівых надзей. Хто не паспее на найбліжэйшым тыдні, той няхай не спазняецца 18 жніўня: паўтор у VOKA Cinema Silver Screen. Але раней — 11 жніўня — тут адбудзецца паказ камедыі «Сірано дэ Бержэрак» з Джэймсам Макэваем.

Ну, і зноў вечны Шэкспір: «Globe: Венецыянскі купец», класіка, якая заўсёды актуальная. У XXI стагоддзі здаецца, што толькі наш час поўны складанымі сацыяльнымі канфліктамі і ментальнымі сутыкненнямі. Але такія якасці як талерантнасць, адкрытасць і міласэрнасць выпрацоўваліся стагоддзямі (15 жніўня ў «Falcon Club Буцік Кіно» і паўтор 25 жніўня ў VOKA Cinema Silver Screen). І пра агульначалавечыя каштоўнасці разважалі яшчэ з часоў Шэкспіра. А ў нас 22 жніўня ў «Falcon Club Буцік Кіно» будзе магчымасць паназіраць не проста за трагедыяй чалавека, якому належыць улада, а яшчэ і за гульнёй Іэна Макелена.

І «разыначка» праекта TheatreHD з англійскім акцэнтам: спектакль-лаўрэат сямі прэмій Лоўрэнса Аліўе і прэміі «Тоні» за найлепшую п'есу «Загадкавае начное забойства сабакі». Не столькі дэтэктыў, колькі паглыбленне ў свет чалавека з аўтызмам (апошні дзень лета, кінатэатр «Цэнтральны»).

Але ёсць тое, што для нас больш блізкае і хвалюючае. Тэатралы чакаюць «Бесаў» Дастаеўскага ў пастаноўцы Канстанціна Багамолава. Насамрэч варта напісаць «у інтэрпрэтацыі», бо гэты рэжысёр вылучаецца аўтарскім прачытаннем, у чым можна пераканацца ўжо 11 жніўня ў «Falcon Club Буцік Кіно».

Працягам тэмы імкнення чалавека да ўнутранай гармоніі, пра што шмат разважаў Дастаеўскі, сёлета стане асобная частка паказаў, арганізаваных Цэнтрам «АРТ Карпарэйшн», прысвечаная жывапісу. Ужо 8 жніўня ў «Falcon Club Буцік Кіно» будзе дэманстравацца дакументальны фільм «Дэга: Запал да дасканаласці». 14 жніўня фільм-выстаўка «Сады ў жывапісе — ад Манэ да Мацiса» (VOKA Cinema Silver Screen). Будзе магчымасць пазнаёміцца з яшчэ адным імпрэсіяністам, праўда, крыху пазней — 28 жніўня ў VOKA Cinema Silver Screen «Сезан. Партрэты жыцця».

Але і для мастацкай класікі будзе час. 15 жніўня ў «Цэнтральным» — фільм «Каналета і мастацтва Венецыі», прысвечаны італьянскаму майстру эпохі класіцызму. І вялікі майстар Адраджэння ў кінатэатры «Цэнтральны»: дакументальны фільм-выстаўка «Загадкі Рафаэля» — па сутнасці, гэта знаёмства з рымскай экспазіцыяй работ мастака (29 жніўня). Як такое яшчэ ўбачыць, асабліва цяпер?

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1:

- капитальное строение, инв. № 412/С-13421 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 123,6 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35/1;
- капитальное строение, инв. № 412/С-13422 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – приемный цех молока), общей площадью 1214,3 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35;
- капитальное строение, инв. № 412/С-13423 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водонапорная башня), общей площадью 10,1 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35/2;
- капитальное строение, инв. № 412/С-13424 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), общей площадью 90,9 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35/4;
- капитальное строение, инв. № 412/С-23727 (назначение – здание специализированное энергетики, наименование – трансформаторная подстанция), общей площадью 21,2 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35/3;
- оборудование: резервуар Я-10В 34025 (2 шт.), артезианская скважина, ограждение, наружные канализационные сети; электроснабжение проходной и наружного освещения молокоприемного пункта «Пески».

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424085404101000240, площадью 2,7361 га (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения (обслуживания строений)), расположенном по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в прибрежных полосах водных объектов, площадью 2,7361 га.

Начальная цена продажи – 82 703,69 руб. (восемьдесят две тысячи семьсот три рубля шестьдесят девять копеек) с учетом НДС.

Сумма задатка – 8 270 руб. (восемь тысяч двести семьдесят рублей)

Продавец – Волковысское открытое акционерное общество «Беллакт», 231900, г. Волковыск, ул. Октябрьская, 133, тел. 8-01512-750-25

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 20 августа 2021 г. в 14.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 24.06.2021 г.

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 18 августа 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,**
**https://grino.by/aukcion**

## Извещение о проведении 19 августа 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

**Предмет торгов**

Капитальное строение (подземное битумохранилище) с инв. № 631/С-59042, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 16.05.2018 года б/н, составленному по состоянию на 25.05.2009 года;

капитальное строение (водопроводная сеть) с инв. № 631/С-58995, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: водопроводная сеть, протяженностью 175,6 м, состоящая из напорного трубопровода, колодца, артезианской скважины, водонапорной башни; капитальное строение (производственно-бытовой корпус) с инв. № 631/С-12108, общей площадью 308,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание производственно-бытового корпуса, с пристройкой, асфальтно-бетонной площадкой, тремя ограждениями (с воротами и столбами); капитальное строение (гудронохранилище) с инв. № 631/С-59045, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: гудронохранилище объемом 2061 куб. м; капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59044, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 948 куб. м; капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59043, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 648 куб. м; капитальное строение (здание весовой, проходной) с инв. № 631/С-12106, общей площадью 81,0 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой, проходной; капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58979, общей площадью 110,1 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание склада с пристройкой; капитальное строение (котельная) с инв. № 631/С-12107, общей площадью 102,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание котельной с пристройкой; капитальное строение (трансформаторная подстанция) с инв. № 631/С-58986, общей площадью 57,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции; капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58980, общей площадью 65,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное здание склада; капитальное строение (компрессорная) с инв. № 631/С-58981, общей площадью 81,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание компрессорной с пристройкой, тремя емкостями; капитальное строение (электроцех) с инв. № 631/С-58982, общей площадью 39,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание электроцеха; капитальное строение (паропровод) с инв. № 631/С-58987, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной паропровод, протяженностью 184,8 кв. м, состоящий из двух участков; капитальное строение (битумопровод) с инв. № 631/С-58989, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной, битумопровод диаметром 75 мм, протяженностью – 201 м; капитальное строение (мазутопровод) с инв. № 631/С-58988, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно технического паспорта на сооружение от 16.05.2018 года б\н составленному по состоянию на 16.06.2009 года; капитальное строение (канализационная сеть) с инв. № 631/С-58990, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная канализационная сеть протяженностью 108 м, состоит из двух участков и четырех колодцев; капитальное строение (линия электропередачи) с инв. № 631/С-58992, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная линия электропередачи протяженность 646,6 м, напряжением 04 кВ, состоящая из четырех участков; капитальное строение (линия наружного освещения) с инв. № 631/С-58993, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: линия наружного освещения протяженностью 19,7 кв. м, напряжением 0,4 кВ, способ прокладки – подземный, состоит из двух участков и двух мачт; капитальное строение (сеть газопровода) с инв. № 631/С-65180, общей площадью 259,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно технического паспорта на сооружение от 23.02.2018 года б/н, составленному по состоянию на 22.02.2018 г. Молодечненским филиалом РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

узел учета газа, инвентарный номер 1372; установка докотловой обработки воды, инвентарный номер 940; резервуар Р 2500000, инвентарный номер 402; резервуар Р-25, инвентарный номер 410; емкость металлическая, инвентарный номер 201; трансформатор ТМ 630/10, инвентарный номер 678; емкости, инвентарный номер 657; емкости, инвентарный номер 658; комплект системы управления «Альфа-П» инвентарный номер 670; комплект системы управления «Альфа-П», инвентарный номер 671; котлоагрегат, инвентарный номер 693; котел Е 1/9, инвентарный номер 695;

котел чугунный водогрейный, инвентарный номер 712; модуль подогрева топлива БСТ-МПТ-12-2, инвентарный номер 715

Сведения о земельных участках:
площадь – 1,5355 га, кадастровый номер – 621350100001000310;
площадь – 4,6829 га, кадастровый номер – 621350100004000541

Местонахождение: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Волкова, 43

Начальная цена: 215 241,22 бел. руб. без учета НДС

Сумма задатка: 21 500,00 бел. руб.

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **19 августа 2021 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 09.08.2021 по 17.08.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам: (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»)**

## Извещение о проведении 18 августа 2021 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

**Сведения о продаваемом имуществе**

| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, бел. руб., с учётом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. номером 240/С-28899 общей площадью 2 162,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Мира, 71А, наименование – здание магазина № 43, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – подвал;<br>капитальное строение с инв. номером 240/С-29803 протяженностью 165 м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Мира, 71, наименование – электрические сети, назначение – сооружение специализированное энергетики электрические сети к магазину № 43, составные части и принадлежности – электрические сети (участок кабеля подземного 0,4 кВВ от ТП-284 до ввода в магазин, участок кабеля подземного 0,4 кВ от ввода в здание магазина до щитовой магазина, участок кабеля подземного 0,4 кВ от щитовой жилого дома до ввода в здание магазина, участок кабеля подземного 0,4 кВ от ввода в здание магазина до щитовой магазина) | Площадь – 0,1949 га, кадастровый номер – 242400000001004376 | 36 576,80 | 3 600,0 |
| 2 | Изолированное помещение*** с инв. номером по бухгалтерскому учету 088554 общей площадью 169,2 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Станционная, 1-17, наименование – торговое помещение, назначение – торговое помещение | - | 18 504,0 | 1 800,0 |
| 3 | Капитальное строение с инв. номером 240/С-45976 общей площадью 115,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2, наименование – здание магазина № 61, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – электрические сети;<br>капитальное строение* с инв. номером по бухгалтерскому учету 084792 общей площадью 22,0 кв.м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2/1, наименование – здание склада | Площадь – 0.0370 га, кадастровый номер – 223684400001000005 | 1 826,89 | 180,0 |
| 4 | Капитальное строение с инв. номером 240/С-44733, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39А, общей площадью 1422,1 кв. м; наименование – здание склада с теневым навесом; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; составные части и принадлежности – теневой навес, площадка | Площадь – 0,4652 га кадастровый номер – 223650100001016130 | 54 769,20 | 5 400,0 |
| 5 | Капитальное строение с инв. номером 240/С-44721, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39Б, общей площадью 494,6 кв. м; наименование – здание склада (картофелехранилище); назначение –здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; составные части и принадлежности – пристройка, забор, площадка | Площадь – 0,2102 га кадастровый номер – 223650100001016129 | 21 228,0 | 2 100,0 |
| 6 | Капитальное строение с инв. номером 240/С-45933, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39В, общей площадью 64,4 кв. м; наименование – здание склада (фруктохранилище), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ;<br>капитальное строение* с инв. номером 240/С-44724, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39В/1, общей площадью 313,1 кв. м; наименование – здание тарного склада; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; составные части и принадлежности – ограждение, площадка | Площадь – 0,1043 га кадастровый номер – 223650100001016128 | 22 818,0 | 2 200,0 |
| 7 | Капитальное строение** с инв. номером 500/С-44605 общей площадью 843,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Суражская, 15, наименование – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер А1/к, д), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: литер а – площадка, литер б – ограждение, литер в – железнодорожные пути | Площадь – 0,3087 га, кадастровый номер – 500000000005003710 | 600 000,0 | 60 000,0 |

**Недвижимое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, рекомендуется осмотр**

** Ограничения (обременения): аренда до 06.10.2021 г. ** Ограничения (обременения): аренда до 31.12.2021 г.*

**** Согласно подпункту 9.1 пункта 9 Указа Президента Республики Беларусь от 31.12.2018 № 506 «О развитии Оршанского района Витебской области», отчуждение расположенных на территории Оршанского района объектов недвижимого имущества, находящихся в государственной собственности и собственности юридических лиц, более 50 процентов акций (долей в уставных фондах) которых находится в государственной собственности, либо входящих в состав холдингов с участием государства, может осуществляться без наличия технических паспортов, а также документов, удостоверяющих государственную регистрацию прав на данное имущество*

**Условия торгов**: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов

**Продавец имущества:** ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель 18.08.2021 по предмету торгов № _ _.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **18 августа 2021 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 09.08.2021 по 16.08.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:** (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»). Дополнительная информация размещена на сайте www.mgcn.by в разделе «Недвижимость в собственность».

УНП 190398583

**15 сентября 2021 г.** **№ 11-Н/2021**

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с продажей права заключения договора аренды земельного участка в г. Гомеле

| № лота | Наименование объекта/адрес земельного участка: г. Гомель | Целевое назначение | Кадастровые номер, площадь земельного участка | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку док-ции, руб. | Наличие ограничений, обременений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, У-277 (по генплану) ул. Новаторская, 18 | **для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома** | 340100000008002386, 0,0756 га | **10 082,38** | **1 000,00** | **3 787,85** | Охранная зона объектов газораспределительной системы. Обременения в связи с присутствием на земельном участке фундамента, следов земляных работ |
| 2 | не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, У-468 (по генплану) ул. Родная, 96 | | 340100000008002120, 0,0855 га | **10 937,82** | **1 000,00** | **3 843,72** | Зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации. Обременения в связи с присутствием на земельном участке фундамента, временного сооружения, следов земляных работ |
| 3 | не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, У-558 (по генплану) | | 340100000008003084, 0,0972 га | **11 783,37** | **1 100,00** | **4 345,24** | Зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации. Обременения в связи с присутствием на земельном участке фундамента, следов земляных работ |
| 4 | не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, У-1378 (по генплану) ул. Полякова, 88 | | 340100000008003610, 0,0810 га | **7 886,48** | **700,00** | **4 501,06** | Охранная зона объектов газораспределительной системы. Обременения в связи с присутствием на земельном участке фундамента, следов земляных работ |
| 5 | не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, У-2303 (по генплану) | | 340100000008004455, 0,0844 га | **8 615,99** | **800,00** | **3 935,43** | Зона санитарной охраны водопроводных сооружений, водоохранная зона рек и водоемов, охранная зона объектов газораспределительной системы. Обременения в связи с присутствием на земельном участке фундамента, следов земляных работ |
| 6 | не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, У-2343 (по генплану) | | 340100000008004238, 0,0780 га | **8 980,64** | **800,00** | **4 021,14** | Охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации, охранная зона объектов газораспределительной системы. Обременения в связи с присутствием на земельном участке фундамента, следов земляных работ |

1. Организатор аукциона – коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).

1.1. **Начальная цена** предмета аукциона **лота № 1** определена как сумма начальной цены не завершенного строительством жилого дома согласно заключению об оценке РУП «Гомельское агенство по государственной регистрации и земельному кадастру» в размере **7 542,22** бел. руб. и начальной цены права заключения договора аренды земельного участка в размере **2 540,16** бел. руб.

1.2. **Начальная цена** предмета аукциона **лота № 2** определена как сумма начальной цены не завершенного строительством жилого дома согласно заключению об оценке РУП «Гомельское агенство по государственной регистрации и земельному кадастру» в размере **8 065,02** бел. руб. и начальной цены права заключения договора аренды земельного участка в размере **2 872,80** бел. руб.

1.3. **Начальная цена** предмета аукциона **лота № 3** определена как сумма начальной цены не завершенного строительством жилого дома согласно заключению об оценке РУП «Гомельское агенство по государственной регистрации и земельному кадастру» в размере **8 517,45** бел. руб. и начальной цены права заключения договора аренды земельного участка в размере **3 265,92** бел. руб.

1.4. **Начальная цена** предмета аукциона **лота № 4** определена как сумма начальной цены не завершенного строительством жилого дома согласно заключению об оценке РУП «Гомельское агенство по государственной регистрации и земельному кадастру» в размере **5 164,88** бел. руб. и начальной цены права заключения договора аренды земельного участка в размере **2 721,60** бел. руб.

1.5. **Начальная цена** предмета аукциона **лота № 5** определена как сумма начальной цены не завершенного строительством жилого дома согласно заключению об оценке РУП «Гомельское агенство по государственной регистрации и земельному кадастру» в размере **5 780,15** бел. руб. и начальной цены права заключения договора аренды земельного участка в размере **2 835,84** бел. руб.

1.6. **Начальная цена** предмета аукциона **лота № 6** определена как сумма начальной цены не завершенного строительством жилого дома согласно заключению об оценке РУП «Гомельское агенство по государственной регистрации и земельному кадастру» в размере **6 359,84** бел. руб. и начальной цены права заключения договора аренды земельного участка в размере **2 620,80** бел. руб.

2. **Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов на земельном участке в г. Гомель, предоставляемом в аренду сроком на 99 лет, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.**

Получить в установленном порядке разрешительную документацию на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство одноквартирного жилого дома. Желающим предварительно ознакомиться с документами обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3–6, № 3–14).

3. **Аукцион состоится 15 сентября 2021 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16,** при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на **5 процентов.**

4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели Республики Беларусь и юридические лица, а также иностранные юридические лица, иностранные граждане. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того, НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указание транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц.** <u>Индивидцальные предпринимпатели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.</u>

**Перечень документов, предоставляемых участником:**

4.1. заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; **гражданам Республики Беларусь** – копия паспорта, **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность;

4.2. представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.3. идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.4. представители индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.5. представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхожденияв (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон, в процессе подготовки и проведения аукциона.

6. **Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

6.1. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;
- часть оплаты предмета аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;
- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;
- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников).

6.2. После совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона местный исполнительный комитет заключает договор аренды земельного участка.

6.3. Гомельским горисполкомом может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 9 августа по 13 сентября 2021 г. включительно. Дни приема: *<u>понедельник, среда, пятница</u>* с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14. Контактный телефон: +375 232 30-12-46.**

**Информация размещена на сайте: www.geodezcentr.by, gomeloblzem.by и в газете «Звязда».**

**15 сентября 2021 г.** **№ 10-Н/2021**

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенного строительством незаконсервированного объекта с продажей права заключения договора аренды земельного участка в г. Гомеле

| № лота | Наименование объекта/ адрес, кадастровый номер и общая площадь земельного участка: г. Гомель | Целевое назначение | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации, руб. | Наличие ограничений |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный объект **в границах улиц Народного Ополчения и Совхозная (кадастровый номер 340100000003003525), (общая площадь 0,6038 га)** | Для строительства объекта «Строительство торгового центра продовольственной и непродовольственной группы товаров». Разрешить в установленном порядке размещение на земельном участке: финансово-кредитных учреждений, зданий проектных организаций, контролирующих органов, общественных организаций, издательств и редакций; торговых центров, фирменных и специализированных магазинов; ресторанов, кафе; гостиниц; парикмахерских, ателье, мастерских, прокатных пунктов, салонов, мини-прачечных самообслуживания; учреждений образования; специализированных больниц, диагностических центров, диспансеров; объектов зеленого строительства: садов, скверов, бульваров; клубов по спортивным интересам, тренажерных и спортивных залов, стадионов ручных игр, спортивных площадок; дома культуры, библиотеки, информационных центров, видео салонов, центров досуга; автостоянок временного хранения, подземных и встроенных гаражей для легковых автомобилей, общественных туалетов. В случаях изменения функционального назначения недвижимого имущества победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона требуется получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет и завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией | **1 130 624,48** | **113 062,45** | **1 750,68** | Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании, в связи с его расположением: в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры – на площади 0,0988 га (охранная зона электрических сетей, на площади 0,1263 га (зона санитарной охраны водопроводных сооружений, на площади 0,0077 га (охранная зона линий связи и радиофикации, на площади 0,0117 га (охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, на природных территориях подлежащих специальной охране на площади 0,0060 га (водоохранная зона рек и водоемов) |

1. Организатор аукциона – коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).

1.1. **Начальная цена** предмета аукциона определена как сумма начальной цены не завершенного строительством незаконсервированного объекта согласно заключению о независимой оценке №21/038и-Н от 22.06.2021г. в размере **1 119 463,99** рубля и начальной цены права заключения договора аренды земельных участков в размере **11 160,49** рубля, необходимого для завершения строительства и обслуживания этого объекта.

2. **Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке продаже не завершенного строительством незаконсервированного объекта с публичных торгов на земельном участке в г. Гомель, предоставляемом в аренду сроком на 5 лет, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.05.2016 г. № 370.**

3. **Аукцион состоится 15 сентября 2019 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на **5 процентов.**

4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели Республики Беларусь и юридические лица, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объеденения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указание транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц.** <u>Индивидуальные предпринимпатели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.</u>

**Перечень документов, предоставляемых участником:**

4.1. заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; **гражданам РБ** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность.

4.2. представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.3. идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.4. представители индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.5. представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности в процессе подготовки и проведения аукциона.

6. **Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:
- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;
- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников) – выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

6.1. Необходимость и величину затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку определить согласно постановлению Совета Министров Республики Беларусь № 298 от 01.04.2014 г. «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку».

6.2. После совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в пункте 6 данного извещения и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи не завершенного строительством незаконсервированного объекта, в тот же срок местным исполнительным комитетом заключается договор аренды земельного участка.

6.3. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка.

**Заявления и соглашения для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 9 августа по 13 сентября 2021 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14.**

**Контактный телефон: 30-12-46. Информация размещена на сайте: www.gomeloblzem.by либо geodezcentr.by, извещение в газете «Звязда» и Государственный комитет по имуществу.**

# НУ І ГЕМАРОЙ!..

## Практолаг пра далікатныя праблемы і іх вырашэнне

**Вёдры з зямлёй і вадой, скрыні з ураджаем — пад'ём і перанос цяжараў прыводзіць да вострай і інтэнсіўнай болі ў заднім праходзе. Аднак не толькі дачныя клопаты могуць стаць прычынай такіх праблем. Ад чаго ўзнікае гемарой? Ці можна з ім справіцца без аперацыі? Як пераадолець сарамлівасць і дайсці да ўрача? Якія малаінвазійныя методыкі прыйшлі на змену ранейшаму лячэнню? Пра гэта і іншае мы пагутарылі з кандыдатам медыцынскіх навук, практолагам вышэйшай катэгорыі медыцынскага цэнтра «ЛОДЭ» Дзмітрыем ГРАБЕННІКАВЫМ.**



### Хваробы амаль трэці насельніцтва

***— Дзмітрый Сяргеевіч, з якімі пытаннямі найчасцей звяртаюцца да практолага?***

— Самае распаўсюджанае — гемарой розных формаў: востры, хранічны. На другім месцы — анальныя трэшчыны, як вострыя, так і хранічныя. На трэцім — эпітэліяльныя хвастцовыя хады, гэта прыроджанае захворванне, якое характарызуецца з'яўленнем вузкага канала ці некалькіх кропкавых адтулін у зоне хвастца. Часта звяртаюцца пацыенты з праяўленнямі сіндрому раздражнёнага кішэчніка — болямі ў жываце, дыярэямі ці запорамі. Вельмі шмат з'явілася пацыентаў з дызбактэрыёзам. Такая праблема ўзнікае, як правіла, праз лячэнне антыбіётыкамі — іх цяпер актыўна прызначаюць. Павялічылася колькасць неспецыфічных язвавых калітаў. Гэта грознае аўтаімуннае захворванне, калі ўзнікае запаленне прамой кішкі і сценак кішэчніка. Пачасціліся і выпадкі выяўлення паліпаў у маладым узросце. Пару дзесяцігоддзяў таму цяжка было знайсці пацыента 30-40 гадоў з паліпамі, цяпер іх нямала.

> **«Пацыенты павінны ісці не па тое, каб не балела і не крывавіла, а да таго ўрача, які ведае, як правільна справіцца з любым выпадкам і звесці да мінімуму болевы сіндром і крывацёк».**

Увогуле практалагічныя хваробы «памаладзелі». Гэта звязана з наступствамі стрэсу, праблем з харчаваннем, а таксама сядзячы лад жыцця, ды і сам рытм жыцця, які стаў занадта хуткі, і трэба ўсё трымаць пад кантролем. Таму дзесьці ў 30 % насельніцтва ёсць практалагічныя праблемы.

***— Як праяўляе сябе гемарой? У каго ён найчасцей сустракаецца?***

— Ад гемарою пакутуюць прыкладна 10 % папуляцыі зямнога шара. Каля 33—42 % пацыентаў практалагічнага профілю — людзі з гемароем. І 90 % з іх — у працаздольным узросце. Кожны пацыент перажывае за год у сярэднім ад трох да шасці прыступаў абвастрэння. І, як правіла, адзін прыступ з трох мае рэцыдывы з-за неадэкватнага лячэння і няправільнага прымянення метадык.

Гемарой — гэта павелічэнне падслізістых сасудзістых утварэнняў — кавернозных цел — у прамой кішцы. Вузлы і ў норме існуюць. Іх падтрымліваюць звязкі, але часта пры запорах, цяжарнасці, падчас натуг звязкі правісаюць і вузлы выпадаюць. Спачатку гэта праяўляецца крывацёкам, але бывае выпадзенне і без крывацёкаў. Вельмі балючы стан — востры гемарой, калі ў вонкавым гемараідальным вузле ўтвараецца тромб.

Першымі сімптомамі гемарою з'яўляюцца болі ў прамой кішцы і заднім праходзе, пякота, сверб, прымесь крыві падчас фізічнай нагрузкі, пры наведванні прыбіральні, на другой і далейшых стадыях — выпадзенне вузлоў. Вылучаюць чатыры стадыі гемарою.

### Аперыраваць ці не?

***— Ці на любым этапе яго можна вылечыць?***

— Так. Але тут важна ўсведамляць, што на першай і другой стадыях яшчэ магчыма кансерватыўнае лячэнне, а вось пры трэцяй і чацвёртай — толькі хірургічнае. Рабіць аперацыю ці не — вырашаць самому пацыенту.

***— Гемарой ахутвае шмат міфаў. Якія самы распаўсюджаныя?***

— Той, што гемарой перараджаецца ў рак. Гэта не так. Іншая справа, што пад гемароем можа маскіравацца рак, ён таксама праяўляецца крывацёкамі. Пацыент мяркуе, што ў яго гемарой, а на самай справе гэта паліп ці штосьці горшае.

***— Чым анальныя трэшчыны адрозніваюцца ад гемарою?***

— Пры запорах ці дыярэі траўміруецца слізістая, утвараецца мікранадрыў, туды трапляе інфекцыя, узнікае болевы спазм сфінктара. Паколькі мы не можам не хадзіць у прыбіральню, кожны раз трэшчына разрываецца, нават калі паспее крыху зажыць. Вострыя трэшчыны існуюць да трох месяцаў, але калі ўтвараецца ранка, якая доўга не зажывае, трэшчына з часам ператвараецца ў хранічную. Вылечыць яе амаль немагчыма, іх заўсёды аперыруюць.

Для вострай трэшчыны характэрны моцныя болі падчас наведвання прыбіральні і пасля, прымесь крыві ў стуле ці на туалетнай паперы. Калі прыкладна 95 % вострых трэшчын можна вылечыць кансерватыўна, то хранічныя трэшчыны, як я ўжо казаў, не вылечваюцца. Часта з-за хранічных трэшчын узнікаюць парапрактыты і параректальныя свішчы. Пры іх інфекцыя з трэшчыны пранікае наскрозь праз прамую кішку — і ўзнікае абсцэс. Стан вельмі няпросты, цяжка лечыцца, толькі аператыўным умяшаннем, прычым не заўсёды паспяхова.

***— Чаму ўзнікаюць запоры?***

— Калі разглядаць псіхалагічны аспект, звычайна практалагічныя захворванні маюць людзі, для якіх характэрныя павышаная скрупулёзнасць, цярплівасць, бераждлівасць, акуратнасць, часам — імпульсіўнасць і высокая агрэсія. Для іх таксама ўласцівыя фобіі: страх за сваё здароўе і страты ўсяго матэрыяльнага. Часта ў такіх людзей выяўляецца падсвядомае нежаданне развітацца з мінулым, цягнуць за сабой праблемы.

З пункту погляду фізіялогіі, прычынамі запораў з'яўляецца няправільнае харчаванне без дастатковай колькасці раслінных валокнаў, яда ўсухамятку, фастфуд, недахоп вады. А таксама стрэс, сітуацыя, калі дзіця не ідзе ў прыбіральню ў школе, а толькі дома, часта да гэтага схільныя дзяўчынкі. Пры цяжарнасці павялічаная матка сціскае кішэчнік, плюс зноў жа, адбіваецца недахоп клятчаткі. Могуць уплываць і пэўныя медыкаменты.

***— Да чаго вядуць запоры?***

— Да гемарою, трэшчын, паліпаў. Ад натуг павышаецца ўнутрыбрушны ціск, адбываецца прыліў крыві — так узнікае гемарой. Альбо лопаецца слізістая, і з'яўляецца трэшчына. Ёсць пацыенты, якія просяць зрабіць аперацыю, каб прайшлі запоры. І некаторыя ўрачы абяцаюць, што пасля аперацыі тыя знікнуць, аднак гэта не так. Бываюць, вядома, практагенныя запоры, калі чалавек баіцца хадзіць у прыбіральню, бо ў яго баліць ці крывавіцца гемарой. Але гэта здараецца рэдка. Першапрычына ўсё ж — запоры і патугі. Таму тут трэба дзейнічаць у двух кірунках: аперыраваць гемарой і лячыць запоры.

***— Як яны лечацца?***

— Ужываннем прэбіётыкаў (элементы ежы, якія не ператраўліваюцца ў верхніх аддзелах страўнікава-кішачнага тракту, а ферментуюцца ў тоўстым кішэчніку) і прабіётыкаў (карысныя бактэрыі, якія жывуць у кішэчніку), правільным харчаваннем, вісцэральным масажам жывата. Рабіць яго можна ў спецыяліста ці самастойна. Таксама скачкі, бег, практыкаванні ёгі выдатныя для кішэчніка. Абавязковы прыём 1,5-2 літраў вадкасці штодзень.

***— Што такое анальныя махры?***

— Часцей за ўсё гэта наступствы перажытага анальнага трамбозу гемараідальных вузлоў. Вена надзімаецца і расцягвае скуру, потым спадае, а расцягнутая скура застаецца. Часта так бывае ў жанчын пасля родаў. Увогуле, падчас цяжарнасці і родаў прыкладна ў 70 % жанчын узнікае гемарой.

***— Ці ёсць небяспека ў анальных махрах?***

— Здараецца, што яны павялічваюцца і націраюцца бялізнай. Улічваючы што ўнутры іх вены, яны могуць свярбець, балець і часам трамбавацца. Бывае, што яны перашкаджаюць гігіене, тады мы рэкамендуем іх выдаляць. Але рызыка з'яўлення ацёку і новай бахромкі даволі вялікая, бо ў вобласці задняга праходу вялікая колькасць вен, адну прыбіраеш — набухае іншая.

### Пераадолець сарамлівасць

***— Нярэдка людзі саромеюцца звяртацца да практолага. Як пераадолець сябе? У чым заключаецца агляд?***

— У нас ёсць спецыяльная аднаразовая бялізна, пацыент пераадзяваецца за шырмай, дзе яго ніхто не бачыць. Аглядзець пацыента можна так, як яму камфортна: на баку, на гінекалагічным крэсле, у каленна-локцевым становішчы. Пры неабходнасці выкарыстоўваюцца анестэзіруючыя мазі. Цяпер ёсць тонкія анаскопы, з дапамогай якіх урач робіць агляд. Вельмі важная папярэдняя гутарка: доктару патрэбна ўмець зняць падсвядомыя страхі і трывогі.

Як пераадолець сарамлівасць? Варта задумацца, што больш энергазатратна: адчуваць сарамлівасць ці потым лячыць цяжкія запушчаныя формы. Трэба падыходзіць з пункту гледжання рэальнай выгады для свайго арганізма. Бывае яшчэ і такі матыў: а раптам у мяне штосьці знойдуць і гэта прыйдзецца лячыць? І людзі цярпяць: лепш не ведаць, чым лячыць. Але ж толькі на ранніх стадыях можна абысціся без аперацыі.

***— Як правільна рыхтавацца да візіту да практолага?***

— Варта зрабіць некалькі ачышчальных клізмаў увечары і раніцай перад прыёмам, пры гэтым не вячэраць і не снедаць. Ёсць свечкі і мікраклізмы мясцовага прымянення, якія выклікаюць натуральнае апаражненне кішэчніка. Яны ставяцца ўвечары і раніцай. Прымаць пераральныя слабіцельныя прэпараты, у тым ліку растворы, я не рэкамендую. Гэта чатыры літры вадкасці, многім пацыентам не ўдаецца іх цалкам выпіць.

***— Ці балючае само абследаванне?***

— Пры вострым болевым сіндроме, акрамя мясцовай анестэзуючай мазі, прымяняецца паверхневая анестэзія ў выглядзе раствораў ці спрэяў.

### Да аперацыі важна выспець

***— Якія новыя метады лячэння, недаступныя яшчэ некалькі гадоў таму, з'явіліся ў практалогіі?***

— Цяпер усё больш пашыраныя малаінвазійныя метады лячэння, у прыватнасці, лазерныя тэхналогіі. Бо сучаснае жыццё такое, што пацыент не хоча адчуваць боль, мусіць як мага хутчэй вярнуцца ў строй. Найперш гэта так званая лазерная каагуляцыя гемараідальных вузлоў, да якой мы дадаём дэзартэрызацыю. Гэта абяскроўліванне артэрыі, якая сілкуе гемараідальны вузел, і выпальванне лазерам самой гемараідальнай тканкі вузла. Такі метад прымяняецца, як правіла, на другой стадыі і ў пачатку трэцяй.

З высокай эфектыўнасцю мы выконваем трансанальную дэзартэрызацыю гемараідальных вузлоў пад кантролем доплера (УГД) з ліфтынгам слізістай. Гемараідальны вузел, які выпаў, абяскроўліваецца і «прышываецца» на сваё ранейшае месца. З часам ён рассмоктваецца. Да гэтага мы дадаём лазернае ці радыехвалевае выдаленне вонкавых вузлоў. Нельга сказаць, што гэта небалючае ўмяшанне, але яно пераносіцца лягчэй, чым стандартная аперацыя. Аднаўленне займае два-тры тыдні, як і пасля стандартнай гемараідэктаміі, але пацыент знаходзіцца дома.

Яшчэ адна папулярная малаінвазійная аперацыя — лазерная каагуляцыя эпітэліяльных хвастцовых хадоў. Замест высячэння, што суправаджаецца вялікай ранай, хады спальваюцца лазерным праменем. Гэтак жа, як і падчас лазернай вапарызацыі анальнай трэшчыны, яна не высякаецца, а спальваецца лазерам. Трэба быць гатовымі да двух тыдняў бальнічнага ліста. Усё роўна раны задняга праходу, як правіла, зажываюць 1,5-2 месяцы. У гэты час яны пабольваюць, выдзяляюць кроў. Канчатковы эфект з'яўляецца праз паўгода.

Важна разумець, што ўсе аперацыі суправаджаюцца болевым сіндромам. Калі абяцаюць, што балець не будзе, гэта няпраўда. І пацыенты павінны ісці не па тое, каб не балела ды не крывавіла, а да таго ўрача, які ведае, як правільна справіцца з любым выпадкам і звесці да мінімуму болевы сіндром і крывацёк. Часам пацыент «плаціць» новым рэцыдывам за адсутнасць болю і крывацёку. Таму лепш пацярпець і зрабіць раз і назаўсёды.

Сучасныя методыкі, калі іх правільна прымяняюць, прыводзяць у 90—95 % выпадкаў да поўнага вылячэння. Гэты працэнт быў высокі і са старымі методыкамі, але ўзнікаў шэраг ускладненняў: пасляаперацыйныя рубцовыя стрыктуры задняга праходу, доўгі болевы сіндром, недастатковасць сфінктара, частыя крывацёкі, доўга не загойваліся раны. Цяпер такіх ускладненняў нашмат менш.

Поспех аперацыі залежыць і ад пацыента. Вельмі важна, каб ён да яе выспеў. Калі пацыент не гатовы развітацца з хваробай, гэта пагражае працяглым і няпростым пасляаперацыйным перыядам.

**Алена КРАВЕЦ.**




# КОВІДНЫЯ БУНТЫ

## Чаму Еўропу захліснула хваля пратэстаў?




**Сотні тысяч чалавек у шэрагу еўрапейскіх краін у чарговы раз выйшлі на пратэсты супраць каранавірусных абмежаванняў. Найбольш маштабныя хваляванні ахапілі Францыю. У акцыях пратэсту супраць планаў улад у рамках барацьбы супраць COVID-19 пашырыць спектр дзеяння «санітарных пашпартоў» узяло ўдзел звыш 200 тысяч чалавек. Аб гэтым паведаміла газета Le Figaro са спасылкай на даныя МУС краіны. Кіраўнік МУС Жэральдо Дарманен паведаміў аб затрыманні дзясяткаў дэманстрантаў. Ён таксама заявіў аб раненні паліцэйскіх падчас сутыкненняў з пратэстоўцамі. Апроч Парыжа, дэманстрацыі прайшлі і ў іншых буйных французскіх гарадах: Марсэлі, Ліёне, Ніцы, Манпелье. Каля 600 чалавек затрымалі ў Берліне на акцыях супраць COVID-абмежаванняў. Як паведаміў таблоід Bild, у Берліне пасля нядзельнай акцыі памёр 49-гадовы мужчына. Таксама людзі выйшлі на пратэсты ў Швейцарыі, Італіі, Грэцыі, Вялікабрытаніі. Чаму Еўропу захліснула хваля пратэстаў, чаго чакаць надалей?**

### Вяртанне «камізэлек»

Апошнім часам у выхадныя вуліцы французскіх гарадоў ізноў запаўняюць натоўпы дэманстрантаў, прымушаючы згадаць «жоўтыя камізэлькі», якія ўзрушылі Францыю да прыходу пандэміі. Толькі цяперашнія дэманстранты пратэстуюць супраць «дыктатуры здароўя» — абмежавальных мер улад у цэлым і ў прыватнасці супраць абавязковай наяўнасці спецыяльнага пропуска з данымі аб вакцынацыі або адмоўнага ПЛР-тэста, без якога французам закрытая дарога ў большасць грамадскіх месцаў і самых разнастайных устаноў. Гэта дае ўсе падставы казаць пра рост у Францыі, якая змагаецца супраць чацвёртай хвалі пандэміі, дыскрымінацыі людзей па наяўнасці або адсутнасці прышчэпак ад каранавіруса, заўважае expert.ru.

Цяперашнія пратэсты з'яўляюцца першымі ў гісторыі сучаснай Францыі маніфестацыямі, якія закранаюць пытанні палітыкі ўрада ў галіне аховы здароўя. Дэманстрацыі далёка не мірныя. Масавыя пратэсты супраць абмежавальных мер пачаліся ў Францыі ў першай палове ліпеня. Па традыцыі французы выходзяць на вуліцы ў выхадныя. Мінулы ўік-энд стаў трэці запар, калі Францыю захліснула хваля пратэстаў супраць абмежавальных мер улад. Аб настрої дэманстрантаў яскрава сведчыць іх вялікая колькасць. Справа ў тым, што цяпер лета, сезон водпускаў, калі французы больш думаюць пра адпачынак, чым аб праблемах і пратэстах, але, як той казаў, накіпела.

Колькасць незадаволеных няўхільна расце — паводле даных МУС Францыі, у мінулыя выхадныя ў параўнанні з папярэднім уік-эндам пратэстоўцаў значна пабольшала. Аб размаху пратэснага руху сведчыць і колькасць праваахоўнікаў. У Парыжы, напрыклад, дэманстрантаў суправаджалі амаль тры тысячы паліцэйскіх, якія імкнуліся не дазволіць ім адхіліцца ад зацверджанага маршруту.

«Мы ствараем сегрэгіраванае грамадства, — выказала адну з, мабыць, галоўных прэтэнзій дэманстрантаў парыжская настаўніца, чыё меркаванне прывёў expert.ru. — Не верыцца, што гэта адбываецца ў краіне, якая абараняе правы чалавека. Асабіста я выйшла пратэставаць першы раз у жыцці. Думаю, наша свабода ў небяспецы».

Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон рэзка асудзіў удзельнікаў акцый пратэсту, абвінаваціўшы іх у цынізме, эгаізме і безадказных паводзінах. Пратэстоўцы, у сваю чаргу, аперыруючь каламбурам «макронавірус», намякаючы, што ўлады краіны выкарыстоўваюць эпідэмію ва ўласных мэтах, каб узмацніць кантроль над грамадствам напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў.




Маніфестанты скандзіравалі лозунгі «Макрон — у адстаўку!», «Дыктатара — у турму!» Лідар партыі «Нацыянальнае аб'яднанне» (раней — «Нацыянальны фронт») Марын Ле Пэн заклікала сур'ёзна паставіцца да патрабаванняў дэманстрантаў і адмяніць прыняцця парламентам меры. Яна адзначыла, што меры ўлад «уяўляюцца несувымернымі ў прынцыпе, жорсткімі ў сваёй рэалізацыі і, шчыра кажучы, часам абсурднымі».

### А як жа правы чалавека?

«Зялёныя пашпарты» (green pass) у ЕС першапачаткова ствараліся толькі для аблягчэння падарожжаў у перыяд пандэміі. Аднак некаторыя еўрапейскія ўрады вырашылі пашырыць сферу прымянення green pass і патрабаваць іх цяпер не толькі на граніцы, але і на парозе кафэ або спартзалы. У ФРГ пашпарты здароўя пакуль не ўвялі, тут многія палітыкі жорстка выступаюць супраць прымусовай вакцынацыі. Тым не менш, як распавёў iz.ru дэпутат берлінскага ландтага (гарадская палата дэпутатаў) Гунар Ліндэман, такія планы ў нямецкага ўрада на мясцовым і федэральным узроўнях ёсць. У ліпені, паводле апытання YouGov, больш за палову немцаў падтрымала пашпарты здароўя.

— Стратэгія федэральнага ўрада ў дачыненні да пандэміі працягвае грунтавацца толькі на лакдаўнах. Хоць, згодна з навуковымі высновамі і вопытам іншых краін, гэта неэфектыўна. Вядома, на такім фоне праходзяць пратэсты, — заявіў iz.ru дэпутат бундэстага ад партыі «Альтэрнатыва для Германіі» Ян Нольтэ. Паводле яго слоў, мітынгоўцы таксама хочуць пазбегнуць ускоснай прымусовай вакцынацыі. «Я магу зразумець гэты неспакой, рашэнне — рабіць прышчэпку ці не — павінна быць свабодным», — дадаў дэпутат.

Відэазапісы, якія паказваюць жорсткае абыходжанне берлінскіх паліцэйскіх з удзельнікамі масавай акцыі пратэсту супраць урадавых мер па барацьбе з пандэміяй, прыцягнулі ўвагу спецдакладчыка ААН Нільса Мельцэра, паведаміла Deutsche Welle. Ён заявіў аб намеры звярнуцца да ўрада Германіі з просьбай пракамендзіраваць жорсткае абыходжанне з пратэстоўцамі. Пасля паступлення адпаведнага запыту ў кабінета канцлера ФРГ Ангелы Меркель будзе 60 дзён, каб даць на яго адказ. Паводле слоў Нільса Мельцэра, некаторыя з прагледжаных ім відэа выклікаюць трывогу з-за паказаных на іх сведчанняў магчымага парушэння правоў чалавека. Эксперт паведаміў, што ўжо паспеў пагутарыць з відавочцамі і лічыць, што размова ідзе як мінімум пра тузін выпадкаў парушэння.

У якасці прыкладу парушэння правоў чалавека Нільс Мельцэр прывёў інцыдэнт, які здарыўся на дэманстрацыі праціўнікаў каранцінных мер у Берліне 1 жніўня. На вуліцы германскай сталіцы выйшла каля пяці тысяч чалавек. Па парадкам у горадзе ў гэты дзень сачыла больш за дзве тысячы паліцэйскіх, якія правялі амаль 600 затрыманняў. На відэа з месца падзей відаць, як паліцэйскі выкарыстоўвае сілавы прыём супраць жанчыны, ад якой не зыходзіла ніякай пагрозы, — хапае яе за горла і штурхае на зямлю. «Яна магла памерці», — канстатуе Нільс Мельцэр. На іншым відэа, якое ён прагледзеў, паліцэйская да крыві збілі мужчыну, які ляжыць на зямлі ў наручніках. Яшчэ аднаго ўдзельніка дэманстрацыі сарвалі з ровара са спіны. «У час шматтысячнай дэманстрацыі, удзельнікі якой не выконваюць каранцінныя меры, аднак не праяўляюць агрэсію, трэба рэагаваць па-іншаму», — рэзюмуе эксперт.




Дырэктар Цэнтра палітычнай інфармацыі Аляксей Мухін лічыць, што трэба не выказваць занепакоенасць парушэннем правоў чалавека ў ФРГ, а прымаць глабальныя меры супраць агрэсіі калектыўнага Захаду. «Такія дзеянні нашых заходніх партнёраў, як істэрычнае сілавое падаўленне мірных пратэстаў у Германіі, з ужываннем спецсродкаў і збіваннем, на корані знішчаюць іх маральнае аблічча», — заявіў riafan.ru палітолаг.

### Зусім не мяккі «штуршок»

У Італіі, паводле даных улад, у мінулы ўік-энд бунты ахапілі каля 80 тысяч чалавек. Пратэставалі супраць абмежавальных мер па ўсім паўвостраве — ад Турына на поўначы да Неапаля на поўдні. Італьянцаў больш за ўсё абурае абавязковая наяўнасць для ўдзелу ў грамадскім жыцці пашпартоў вакцынацыі (так званага «зялёнага пропуску») або адмоўнага ПЛР-тэста. Не дзіўна, што дэманстранты скандзіравалі: «Свабода!» і «Далоў дыктатуру!» На італьянцаў слаба падзейнічала заява прэм'ер-міністра Марыё Драгі, які растлумачыў абмежаванні штамам «дэльта» і тым, што гэтыя меры дадуць магчымасць абысціся без чарговага лакдаўна.

У Італіі, як і ў Францыі, да пратэснай хвалі падключыліся палітыкі правага спектра. Так, лідар партыі «Браты Італіі» Джарджыа Мелоні нядаўна заявіла, што яна не супраць вакцын, а «супраць абавязковай вакцынацыі». Шэраг дэпутатаў партыі зладзіў дэманстрацыю ў італьянскім парламенце супраць «зялёнага пропуска», у выніку чаго адзін з парламентарыяў быў выведзены з будынка ахоўнікамі. У сваю чаргу, лідар партыі «Ліга Поўначы», колішні віцэ-прэм'ер Матэа Сальвіні, заявіў пра сваю нязгоду з абавязковай вакцынацыяй моладзі і настаўнікаў. «Размовы пра тое, каб зрабіць прышчэпкі 13—14-гадовым дзецям і настаўнікам, не адпавядаюць маім уяўленням аб свабоднай краіне», — заўважыў Сальвіні.

Тым часам стала вядома, што італьянскі ўрад вырашыў з 1 верасня пачаць больш шырока прымяняць сертыфікаты green pass, каб больш эфектыўна супрацьстаяць каранавіруснай інфекцыі, паведаміў тэлеканал TGcom24. Гэтыя сертыфікаты будзе неабходна прад'яўляць на самалётах, цягніках, паромах, аўтобусах пры паездках паміж рэгіёнамі Італіі. Таксама дакумент спатрэбіцца студэнтам для наведвання заняткаў ва ўніверсітэтах. Указ урада таксама прадугледжвае неабходнасць вакцынацыі ўсяго персаналу ў навучальных установах. Італьянскім школьнікам сертыфікаты не патрабуюцца. Раней улады распаўсюдзілі дзеянне green pass на басейны, спартзалы, кіно, стадыёны, тэатры. Дадзены сертыфікат змяшчае інфармацыю альбо пра вакцынацыю, альбо пра перанесены COVID-19, пра зроблены нядаўна тэст на каранавірус.

Па словах эпідэміёлага, дырэктара дэпартамента малекулярнай медыцыны Падуанскага ўніверсітэта Андрэа Крызанці, «зялёны пашпарт» «не абароніць нас ад каранавіруса, таму што гэта не шчыт, падобны да маскі або сацыяльнай дыстанцыі; пропуск, хутчэй, служыць «мяккім штуршком» для тых, хто сумняваецца ў вакцынацыі супраць віруса». Як бачым, «штуршок» атрымліваецца зусім не мяккі.

### Людзі выходзяць на вуліцы

У грэчаскай сталіцы на плошчы перад парламентам у мінулую суботу сабралася каля чатырох тысяч афінян. І тут не абышлося без боек паміж дэманстрантамі і паліцыяй, якія ўжывалі бутэлькі з гаручай сумессю і слёзатачывы газ адпаведна. Сітуацыя ў гэтай краіне рэзка пагаршаецца, што вымусіла ўлады пайсці на крайнія меры. Днямі стала вядома, што Грэцыя ўводзіць каменданцкую гадзіну і забарону музыкі ў забаўляльных установах на двух папулярных турыстычных астравах — Закінф і Крыт, каб стрымаць распаўсюджванне COVID-19, паведаміла Reuters. Абмежаванні пачалі дзейнічаць з 6 жніўня і будуць працягвацца тыдзень. Адзначаецца, што эпідэмічная сітуацыя ў параўнанні з папярэднім тыднем пагоршылася на 69 працэнтаў на востраве Закінф (захад Грэцыі), а на востраве Крыт у горадзе Ханьян дадзены паказчык вырас на 54 %.

А Канстытуцыйны савет Францыі прыняў з агаворкамі раней ухваленыя парламентам новыя меры ўрада па барацьбе з пандэміяй каранавіруса, паведаміла ТАСС. Урад Францыі плануе, што закон увойдзе ў сілу з 9 жніўня. Лідары апазіцыйных французскіх партый выказалі незадаволенасць дадзеным рашэннем у сваіх сацыяльных сетках. Кіраўнік партыі «Непакорная Францыя» Жан-Люк Меляншон назваў рашэнне савета «вельмі несуцяшальным». Ён таксама ўказаў у сваім «Твітэры», што Канстытуцыйны савет «не забяспечвае абарону ніякіх свабод, якія ставіць пад пагрозу «санітарны пропуск». Са свайго боку, Марын Ле Пен у «Твітэры» абвінавачвае ўрад краіны ў «татальнай крывадушнасці». Паводле яе слоў, Канстытуцыйны савет «вельмі хутка цэнзуруе любыя жорсткія меры супраць законнай і незаконнай іміграцыі», у той час як «не знаходзіць нічога супраць закона, які перашкаджае свабодзе перамяшчэння французаў у іх уласнай краіне, па прынцыпе вакцынацыі».

Учора французскія СМІ паведамілі пра тое, што ў Парыжы пачаліся акцыі пратэсту супраць спрэчнага законапраекта — дэманстранты накіраваліся ў бок Пале-Раяль.

— Пратэсты могуць працягвацца доўга, гэта прыкмета вялікага недаверу да ўрада. Людзі не толькі выступаюць супраць пропуска, які, па іх словах, дазволіць дзяржаве кантраляваць іх жыццё, яны таксама хочуць паказаць сваю незадаволенасць вялікім разрывам, які існуе паміж элітай і звычайным грамадзянінам, — заявіў iz.ru навуковы супрацоўнік Інстытута міжнародных і стратэгічных адносін L'IRIS (Парыж) Жан-Іў Камю.

Гледзячы па ўсім, жнівень у Еўропе будзе насамрэч гарачы — хваля бунтаў набірае моц. Дарэчы, убачым ужо ў найбліжэйшыя дні.

**Захар БУРАК.**

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Выигрывай с Каталогом Onliner и Mastercard 3»

Настоящие правила проведения Рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Выигрывай с Каталогом Onliner и Mastercard 3» (далее – Рекламная игра).

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующие значения:

**Интернет-сайт Организатора** – размещенный в глобальной сети Интернет сайт (интернет-ресурс), расположенный по адресу https://www.onliner.by.

**Пользователь** – физическое лицо, использующее интернет-сайт Организатора и соглашающееся с Правилами пользования ресурсом (https://blog.onliner.by/siterules).

**Учетная запись (профиль)** – хранимая в компьютерной системе совокупность данных о пользователе сайта, необходимая для его аутентификации и предоставления доступа к его личным данным и настройкам.

**Onliner Pay** – сервис онлайн-оплаты товаров на интернет-сайте Организатора, позволяющий осуществлять оплату товаров безналичным способом с использованием валидированной (привязанной) к учетной записи (профилю) пользователя банковской платежной карточки. Сервис реализует механику безопасной оплаты. Партнерами сервиса выступают «МТБанк» и платежный сервис bePaid. Процессинговая система bePaid соответствует всем требованиям стандарта безопасности PCI DSS Level 1, который регламентирует прием, обработку и хранение карточных данных.

**Банковская платежная карточка** – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**1. Организатор Рекламной игры**

